Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Ц... Камітэту Саветаў БССР.

10 год вы...

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, не зарокаюцца — не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародніх — 20 к., мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраглі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраглі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапіраглі поперад тэксту 1 р. 50 к. Сьвяшчы на 50 проц. дарожай. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. шалёгу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 •. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 •. За кожны дадатковы — 5 •. Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 171 (2660) Аўторак, 30-га ліпеня 1929 г.

Адстаўка францускага габінэту.

Урад Пуанкарэ, які падаўся ў адстаўку, быў урадам, адбіваўшым, перш-на-перш, інтарэсы буйнага капіталу ў асобе яго найбольш кансэрватыўных груповах. Галоўнаю задачаю, пастаўленаю перад ім, была стабілізацыя зусім выбітага з каляіны ў выніку вайны і пасьляваеннай разрухі фінансавага становішча Францыі. Гэты ўрад абапіраўся адначасна і на падтрыманьне так званых «левых» партый (радыкалы, радыкал-сацыялісты і інш.), якія адбівалі інтарэсы дробнай буржуазеі і капіталу, занятага ў лёгкай прамысловасьці. Гэтыя „левыя" групоўкі паслухмяна пайшлі за Пуанкарэ, супроць якога раней праводзілі паказную барацьбу.

Скаляціўшы, такім чынам, сабе даволі трывалую большасьць з партый ранейшага «нацыянальнага адзінства» і большай часткі разваленага „левага" блёку, урад Пуанкарэ ў выніку шэрагу заходаў, цалкам накіраваных супроць інтарэсаў працоўных мас, да вядомай ступені апраўдаў пастаўленую яму буйным банкаўскім капіталам задачу, правёўшы стабілізацыю франка. Гэты процэс выклікаў за сабою рост дарагоўлі, павялічэньня ападаткаваньня і іншыя захады, якія моцна выцялі ня толькі па інтарэсах рабочай клясы, але закранулі і значныя праслойкі дробнай буржуазеі. Паступова палітыка Пуанкарэ штурхала ад сябе тыя гушчы, якія ішлі за «левымі" групамі. Трацячы ўсё больш і больш сваю апору ў краіне, узбройваючы проці сябе ўсё больш працоўныя масы Францыі, гэты ўрад спрабаваў за апошні час умацавацца, распачаўшы выключна вострае прасьледваньне пралетарскіх арганізацый і камуністычнай партыі Францыі. Але гэта не дапамагло. Пытаньне аб ратыфікацыі даўговых згод з Англіяй і Амэрыкай зьявілася каменем, аб які па сутнасьці разьбіўся гэты ўрад, меўшы да апошняга часу пастаянную парляманцкую большасьць і захаваўшы ня нават пры апошніх галасаваньнях. Ураду Пуанкарэ не ўдалося, адпак, нават атрымаўшы фармальную парляманцкую перамогу, спакойна выбрацца з перашкод, якія ўзьніклі ў зьвязку з гэтым пытаньнем, рашэньне якога французская палітыка безнадзейна зблытаўшыся, магла знайсьці толькі ў безагаворачнай капітуляцыі перад патрабаваньнямі францускіх ліхвяроў. Падача ў адстаўку Пуанкарэ амаль што непасрэдна пасьля ратыфікацыі даўгавых згод нельга не паставіць у сувязь з тою пятрываласьцю, якая стварылася ў нижній палаце ў часе абмеркаваньня пытаньня аб ратыфікацыі.

Перад цьвёрдасьцю Злучаных Штатаў, якія не згаджаліся ні на якія ўступкі, Пуанкарэ прымушан быў ісьці напралом, патрабуючы ад парляманту тэрміновай і безагаворачнай ратыфікацыі.

Радыкалы выкарысталі такое етановішча, каб унесьці разлад у большасьць, на якую абапіраўся Пуанкарэ, і падрыхтаваць у палаце кадры для нейкай новай урадавай камбінацыі з надзеяй адыгрываць там вірую-чую ролю. Фармальна барацьба правадзілася навакол пытаньня аб тым, ці ратыфікаваць даўгавыя згоды з агаворкаю аб тым, што францускія выплаты ставяцца ў залежнасьць ад узносу выплат з Нямеччыны, або ратыфікаваць іх безагаворачна. Злучаныя Штаты ні па якія агаворкі не згаджаліся, вось чаму натугі габінэту Пуанкарэ былі згрупаваны на тым, каб агаворкі скасаваць ці, прынамсі, вылучыць іх у асобную бясспрэчную рэзалюцыю. Задача Пуанкарэ ўскладнілася тым, што проці яго ў гэтым пытаньні выступілі правыя з групы Марэна, якія раней былі яго галоўнаю апорай.

Праўда, большасьць правых, дзеля таго, каб заставіць Пуанкарэ, знайшла магчымым ахвяраваць ілюзіі аб магчымасьці скасаваць даўгі, але ўсё-ж такі ўрадавая большасьць, пры дапамозе якой ужо ня гэтулькі Пуанкарэ, колькі замяніўшым яго на рашаючым пасяджэньні палаты Брыяну, удалося правесьці ратыфікацыю, была надзвычайна малою.

Перамова ўраду аказалася Піраваю перамогаю і пад прыкрыцьцём заняджаньня найбольш яркі стаўленьнік буйнага фінансавага капіталу прымушан быў падацца ў адстаўку разам з усім габінэтам. Праўда, у мінулым Пуанкарэ ня раз практыкаваў адстаўку для таго, каб мэтадам каротказтэрміновага адыходу ад улады тым лепш падрыхтаваць грунт для свайго звароту. На падставе надасланых тэлеграм можна бачыць, што больш за ўсё шансаў на складаньне габінэту мае Брыян, які займаў у мінулым габінеце пасаду міністра замежных спраў. Прыход яго да ўлады знаходзіцца ў адпаведнасьці з тою надворнаю зьменаю міжнароднага становішча, якая стварылася ў выніку мінулагодн. прыходу да ўлады сацыял-дэмакратыі ў Нямеччыне і лібэралаў у Англіі.

Але зразумела, што габінэт Брыяна ня здолее ажыцьцёвіць надзеі дробнай буржуазеі і нават сваё ўласнае існаваньне ён здолее забясьпечыць толькі ў тым выпадку, калі будзе шукаць падмогі далёка направа. З гэтае прычыны, наўрад ці можна чакаць ад новага габінэту значных зьмен у палітыцы Францыі.

Для франка-савецкіх дачыненьняў пэрыяд габінэту Пуанкарэ, пачынаючы з 1926 году, быў пэрыядам таптаньня на месцы. Распачатыя было яго папярэднікамі з пэрспэктывамі на посьпех перамовы былі перарваны пры ўрадзе Пуанкарэ не па віне Савецкага Саюзу; з таго часу ніякіх пэрспэктыў на вырашэньне пытаньняў, якія ўзьнікаюць у адносінах між Савецкім Саюзам і Францыяй, ня было. За ўсе гэтыя 3 гады франка-савецкія дачыненьні. Ці не зварухнуліся з мёртвага месца, ці здолее зьмена габінэту зьявіцца пачаткам зруху гэтых дачыненьняў у лепшы бок, пакуль што мы ня ведаем.

Пралетарыі-батракі даюць адпор абнаглеўшым польскім абшарнікам.

У апошні час польскія газэты зьмяшчаюць весткі гэраічнай барацьбы пралетарыяў-батракоў Заходняй Украіны. Панскі бот абшарніка „растаптаў усе правы, усе заваёвы, якія мелі батракі ў часе рэвалюцыйнага ўздыму (1918-20 г.). Батракі жывуць у значна горшых варунках, чымся да вайны. Непамерная эксплёатацыя, выціскальне апошніх сіл, заработак--паўгалодны паёк, якога не хапае на пражыцьцё сям'і, давялі батрака да такога становішча, што ў вочы заўсёды заглядае галодная сьмерць. Батракі ўзварухнуліся, пачалі барацьбу за павялічэньне заработку, за людзкія абыходзіны.

Забастовачны рух батракоў у Заходняй Украіне распачаўся з вясны і цяпер, ня гледзячы на суровы тэрор паліцыі, на здрадніцкую работу сацыял-фашыстаў, на дзікія катаваньні, забойствы, арышты,— забастоўка ня спыняецца, а дзе-ні-дзе нават абвастраецца.

Вось што піша газэта „Дзеньнік Крэсовы": „Да нябывалага скандалу дашло ў маёнтку «Берастовіны», Бабрэцкага павету. Двор гэты належыць да Скарбоўскай, а прыбыткі ідуць на ўтрыманьне сіраты ў Даравыжы пад Мікалаевым. З прычыны забастоўкі сірата апынуўся-б у самым блізкім часе ў трагічных фінансавых варунках.

У сувязі з гэтым павятовы камэндант дзяржаўнай паліцыі пастанавіў даць паліцыйную абарону 11 лясьнікам з ваколічных лясоў, якія выказалі гатоўнасьць падтрымаць гаспадарку толькі найпатрабнейшай працай у маёнтку.

Натоўп бастуючых, аднак, не хацеў і думаць аб дапушчэньні лясьнікоў да работы. Падбураныя агітатарамі сельска-гаспадарчыя работнікі пазакідалі паліцыю каменьнямі, жадаючы забраць у свае рукі лясьнікоў і ўчыніць над імі самасуд. Паліцыя без страляніны здолела прывесьці лясьнікоў у двор, а пасьля адважным наступам адагнала натоўп ад агарожы маёнтку. Брамы замкнулі. Аднак, натоўп не здаваўся і пачаў атаку. Паведамленыя атакуючымі фальварак парабкі з суседніх двароў зараз-жа пазьбягаліся і пабольшылі рады атакуючых. На фальварку, апроч 11 лясьнікоў, знаходзілася 22 паліцыянты пад кіраўніцтвам афіцэра. Пастаноўлена не страляць, пакуль будзе магчыма.

Позна ўвечары атакуючыя маёнтак парвалі тэлефонную сувязь. Атака трывала ўсю ноч. Раніцою, паліцыі, заатакаванай у маёнтку, удалося выслаць пасланца, які прабраўся праз рады атакі і дайшоў да бліжэйшага пастарунку паліцыі. Адтуль паведамілі Бабрэцкае староства і Львоўскае ваяводзтва. Львоўскі ваявода выдаў загад неадкладна выслаць у Берастовіцы рэзэрвы паліцыі з 40 паліцыянтаў".

Абшарнікі і ўвесь фашысцкі апарат устрывожаны. Буржуазныя газэты заклікаюць урад «палажыць канец, задушыць вайсковай сілай „бунт", арыштаваць і пакараць усіх так, каб другія мелі навуку". Папы і ксяндзы з амбонаў заклікаюць да паслухмянасьці. Але дарэмныя патугі. Клясавая сьвядомасьць бярэ верх. Пралетарыі-батракі ідуць на дапамогу сваім таварышом з другіх маёнткаў. Бяз усякай зброі, з віламі і сякерамі абкружылы ўзброеных да зубоў паліцыянтаў і лясьнікоў і паліцэйская зграя ня здольна адстаяць паціску. Ваявода даў загад выслаць дапамогу. Магчыма, што на гэты раз разбэшчанай паліцэйшчыне ўдасца затапіць у крыві забастоўку, сурова расправіцца з забастоўшчыкамі, але ніколі ня ўдасца зламаць клясавую сьвядомасьць застанавіць бушуючы людзкі акіян.

І. Гак.

Тав. Даўгалеўскі ў Лёндане.

ЛЁНДАН, 29-7. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Парыжы Даўгалеўскі 28-га ўночы прыехаў у Лёндан. На вакзале Даўгалеўскага спаткалі прадстаўнікі міністэрства замежных спраў і прадстаўнік бэрлінскага пасольства Хайн.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку Даўгалеўскі выказаў надзею, што прыяцельскія адносіны між абедзьвума краінамі будуць адноўлены.

БУРЖУАЗЕЯ СТАРАЕЦЦА НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ПЕРШАЖНІВЕНЬСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ.

ПРАЦОЎНЫЯ ЎСЯГО СЬВЕТУ ПРАДЭМАНСТРУЮЦЬ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ Ў АБАРОНУ СССР.

Стварыць арганізацыю пралетарскай самаабароны.

БЭРЛІН, 28-7. У Гамбурзе адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў рабочых фабрык і заводаў, будаўнічых рабочых і беспрацоўных. Канфэрэнцыя ўхваліла: 1) заснаваць антывасны камітэт з 25 прадстаўнікоў рабочых галоўных прамысловых прадпрыемстваў, працоўнай моладзі і жанчын; 2) падаць патрабаваньне сэнату (гамбурскаму ўраду) аб скасаваньні забароны дэманстрацый у Гамбурзе; 3) стварыць арганізацыю пралетарскай самаабароны і 4) у Міжнародны Чырвоны Дзень 1 жніўня спыніць працу на гадзіну раней і правесьці масавыя дэманстрацыі.

* * *

БЭРЛІН, 28-7. Арганізацыі пралетарскай самаабароны Рурскай вобласьці зьвярнуліся да ўсіх працоўных мас Нямеччыны з заклікам заснаваць на ўсіх прадпрыёмствах атрады пралетарскай самаабароны для барацьбы проці фашызму і ў абарону СССР.

Масавыя аблавы і арышты.

ВЕНА, 27-7. Водлуг паведамленьня з Сафіі, мясцовая паліцыя ўчыніла аблаву ў рабочых кварталах, шукаючы „нелегальных камуністаў". Пры аблаве арыштавана больш за 50 чал.

АРЫШТЫ І ВОБЫСКІ НЯ СПЫНЯЮЦЦА.

ВЕНА, 29-7. З Сафіі паведамляюць, што ў зьвязку з падрыхтоўкаю да Міжнароднага Чырвонага дню паліцыя ўчыніла ўчора ў рабочых райёнах масавыя вобыскі. Абшуканы памяшканьні рабочай партыі і незалежных прафсаюзаў, прычым, нібыта, выкрыты праклямацыі. Арыштавана 33 асобы. Спынена рабочая газэта „Роботніцкая справа".

Заклік да аднагадзіннай стачкі пратэсту-дэманстрацыі.

ВЕНА. Антывасны камітэт на сваім апошнім пасяджэньні ўхваліў пашырыць на прадпрыемствах агітацыю за ўдзел у першажнівеньскай дэманстрацыі, якая павінна распачацца а 7-ай гадз. раніцы на пляцу Волі і адтуль накіравацца ў цэнтр гораду. Аднагадзінная стачка пратэсту павінна распачацца на гадзіну раней да спыненьня працы.

Левыя прафсаюзы---за баявы Чырвоны Дзень.

НЬЮ-ЁРК, 27-7. Дэлегацкая канфэрэнцыя левых прафсаюзаў, якая адбылася ў Нью-Ёрку, ухваліла прыняць дзейны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні дэманстрацыі 1 жніўня

ПАРЫЖ, 27-7. Унітарныя прафсаюзы будаўнічых рабочых і служачых зьвярнуліся да ўсіх будаўнікоў з адозваю, у якой заклікаюць іх актыўна ўдзельнічаць у дэманстрацыях у міжнародны Чырвоны дзень 1-га жніўня пад лёзунгам і барацьбы проці імпэрыялістычнай вайны, на абарону СССР і за жыцьцёвыя патрабаваньні працоўных мас.

НА ФРОНЦЕ КЛЯСАВАЕ БАРАЦЬБЫ.

Арышты студэнтаў.

ТОКІЁ, 27-7. Водлуг паведамленьня газэт, паліцыя арыштавала нядаўна 30 студэнтаў па абвінавачаньні „ў спробе заснаваць новую агульна-японскую камуністычную арганізацыю моладзі"

Галадоўка францускіх камунараў.

ПАРЫЖ. 28-7. Як паведамляе агенцтва Гаваса, камуністы, арыштаваныя на працягу апошніх дзён абвінавачаныя ў «наладжаньні вжовы» абвясьцілі галадоўку.

Паліцыя застрэліла трох і некалькі параніла.

ВЯНА, 29-7. У Самборы, каля Загрэбу (Харватыя) паліцыя абкружыла дом, у якім, нібыта, адбываліся камуністычныя сходы. Згодна завярэньня паліцыі, тыя, хто знаходзіўся ў памяшканьні, распачалі страляніну з рэвальвэраў. Паліцыя ў свой чарод выпусьціла каля 100 стрэлаў з вінтовак і рэвальвэраў, прычым забіты тры асобы з ліку тых, што знаходзіліся ў абкружаным доме. Думаюць, што забітыя—студэнты загрэбскага унівэрсытэту.

Надзвычайны суд у Белградзе прыгаварыў на 10 гадоў астрогу рабачага Мірко Букавацу, у якога пры вобыску, нібыта, знойдзена некалькі камсамольскіх газэт і друкарскі варштат.

ПРАТЭСТ ПРАЦОЎНЫХ ПАЗШ.

НЬЮ-ЁРК, 26-7. Па ўсёй Амэрыцы адбываюцца скліканыя кампартыяй мітынгі пратэсту проці надыходзячага працэсу 15-ці лідэраў бастуючых тэкстыльшчыкаў Гастоніі, аддадзеных пад суд па абвінавачаньні ў забойстве мясцовага начальніка паліцыі.

УЦЁК З-ПАД ВАРТЫ ЗАБІЎШЫ ЖАНДАРА.

ВЕНА. Як паведамляюць з Белграду, прывезены з Сэраева ў Рагузу арыштаваны па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі Язэп Чолан уцёк на станцыі Рагуза, застрэліўшы праводзіўшага яго жандара і параніўшы на сьмерць другога жандара. Шуканьне паліцыі не дало ніякіх вынікаў.

Паход супроць францускае кампартыі.

МАСАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТУ.

ПАРЫЖ, 28-7. Учора ў Ліёне пасьля вобыску ў памяшканьнях францускай кампартыі, унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы, МОПРу і на кватэрах 50 сяброў партыі і працаўнікоў асьветы рабочыя наладзілі масавыя дэманстрацыі пратэсту проці наскоку на пралетарскія арганізацыі. Ля брамы заводаў і фабрык адбыліся шматлікія мітынгі пратэсту проці вайны і за амністыю. Такія-ж дэманстрацыі і мітынгі наладзілі ліёнскія чыгуначнікі.

* * *

ПАРЫЖ, 27-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Паліцыя ўчыніла шмат вобыскаў сярод камуністаў у Лілі і Ліёне. Захвачана шмат дакумантаў. У Лілі арыштавана двое. Выданы загад аб арышце ня мог быць выкананы, бо асобы, падлягаючыя арышту, уцяклі заграніцу".

РЭФАРМІСТЫ ТАКСАМА „ПРАТЭСТУЮЦЬ".

ПАРЫЖ, 28-7. Орган сацыялістаў «Пэйпль» пад загалоўкам „Наконт няіснуючай змовы і арыштаў з мэтаю папярэджаньня" агаласіў дэклярацыю рэфармісцкай канфэдэрацыі працы, якая на словах пратэстуе проці рэпрэсій ураду ў адносінах камуністаў, а на справе накіравана проці францускай кампартыі.

Брыян фармуе габінэт

„САЦЫЯЛІСТЫ" ПАТРАБУЮЦЬ МІНІСТЭРСКАГА КРЭСЛА.

ПАРЫЖ, 28-7. Брыян распачаў перамовы аб складаньні новага габінэту. Галоўная цяжкасьць, з якою Брыян стыкаецца пры складаньні габінэту гэта патрабаваньне радыкалаў, удзел якіх ва ўрадзе неабходна для правядзеньня замежна-палітычнай лініі Брыяна „аб выключэньні з складу ўраду прадстаўнікоў правага „рэспубліканска-дэмакратычнага саюзу", і перадачы прадстаўніку радыкалаў пасады міністра ўнутраных спраў (занятага ў апошнім урадзе Пуанкарэ лідэрам рэспубліканска - дэмакратычнага саюзу Тард'е).

Адначасна правыя і, асабіва, правы цэнтр рашуча стаяць за захаваньне Тард'е на яго пасадзе, асабліва напярэдадні міжнароднага Чырвонага дню 1 жніўня.

Пытаньне аб запрашэньні сацыялістаў у габінэт ня ўзьнімаецца. Аднак, парляменцкая фракцыя сацыялістычнай партыі ўхваліла рэзалюцыю, у якой энэргічна пратэстуе проці «незаконнага перарыву працы парлямэнту, гэтым перарывам. Урад перашкодзіў правядзеньню законапраэктаў аб зьмяншэньні падатковага цяжару і аб амністыі».

І далей заяўляецца:

«У выпадку ўцягненьня ў будучы ўрад тых, хто ва ўчарайшым урадзе быў агентам рэакцыі фашызму, сацыялісты гатовы абараняць рэспубліканскія свабоды на перадавых пазіцыях".

Польскі друк патрабуе...

ВАРШАВА, 27-7. Польскія палітычныя колы і польскі друк выказваюць трывогу у зьвязку з нацыходзячай палітычнай рэпарацыйнай канфэрэнцыяй.

«Газэта Варшавска» зазначае, што Румынія і Югаславія заявілі патрабаваньне аб дапушчэньні іх на канфэрэнцыю і дамагаюцца, каб Польшча таксама ўдзельнічала ў канфэрэнцыі.

Нацыянальныя нявольнікі ў сусьветнай вайне.

(Артыкул тав. Марты).

Так званыя цывілізаваныя дзяржавы праз міжнародную згоду зьнішчылі гандаль нэграмі. Сапраўды, белыя ўжо ня купляюць чорных—мужчын—жанчын—для пасылкі іх у Амэрыку. Яны робяць больш хітра і нішчыра. У якасьці марскога мэханіка я аб'ехаў узьбярэжжа Паўночнай Афрыкі і Азіі і ўсюды пераконваўся ў тым, што скасаваньне нявольніцтва на паперы мала зьмяніла цяжкі лёс прыгнечаных калёніяльных народаў.

Асабліва вылучаюцца ў гэтым францускія „цывілізатары". У пачатку 1922 году я бачыў у Сайгоне аднаго аннаміта, які быў павешаны за ногі на мачце дзяржаўнага гідраграфічнага параходу „Ляманш" за тое, што ён, абараняючыся, выцяў таго, хто яго біў. Ён памёр праз два дні ад вынікаў падвешваньня і ад удараў.

У часе імпэрыялістычнай вайны, калі францускае войска вельмі спустошвалася дзякуючы бяздарнасьці генэралаў, было ўхвалена папоўніць армію калёніяльнымі салдатамі.

У Алжыры францускі ўрад загадзя абвясьціў, што ён заклікае да патрыятызму ўсіх алжырцаў і пры звароце іх з вайны паставіць на абмеркаваньне пытаньне аб рэарганізацыі Алжыру і наданьні яго насельніцтву правоў францускіх грамадзян.

Рэкруцкі набор прайшоў даволі добра пры дапамозе францускіх і тубыльскіх жандараў. Але ў ходзе вайны ўсе ўбачылі, што з выяжджаўшых варочаліся вельмі нямногія, і пачалося масавае дэзэртырства. Адны выходзілі з вёсак яшчэ да прызыву, іншыя, больш здагадлівыя, дачакаліся выдачы ім вопраткі і зброі і ўцякалі ў поўным узброеньні цэлымі ўзводамі. У горных схілах Кабіліі згуртавалася некалькі тысяч дэзэртыраў і нельга было іх злавіць там, ня рызыкуючы сваёй галавой.

У Сэнэгале, краіне больш адсталай, дзейнічалі інакшым спосабам.

Вясковыя старасты атрымлівалі праз кожных 6 месяцаў парад на пэўную колькасьць людзей, якіх яны павінны былі даставіць ураду. Яны былі адказнымі за невыкананьне нараду і нават арыштоўваліся. На другі год вайны і гэта ўжо не дапамагала, не зважаючы на кампанію, якую праводзіў чорнаскуры дэпутат—сацыяліст Дыян. Тады было ўхвалена, што вёскі, якія ня прышлюць належнай колькасьці людзей, будуць спаленымі. Але дэзэртырствы былі, аднак нагэтулькі шматлікімі, што ўрад прымушан быў абкружаць вёскі загадзя. Гэта лёгка было ажыцьцёвіць, бо сярод народнасьцяў Сэнэгалы панавала вострая нацыянальная варожасьць і, такім чынам можна было прымусіць стральцоў вёскі „Бамбара" абкружыць вёску „Тукулер" і наадварот.

Гэтак сама дзейнічалі і на Мадагаскары.

Нарэшце, у Інда-Кітаі, дзе насельніцтва прызвычаілася на працягу стагодзьдзяў да поўнага падначаленьня, было ня вельмі цяжка набраць шматлікія жоўтыя баталёны.

Але, не зважаючы на тое, што іх разьвіцьцё знаходзіцца ў пачатковым стане, на поўнае няведаньне імі ўласнай пісьмовай мовы, індакітайскія салдаты хутка ўцямілі ў чым справа.

Што-ж датычыць сэнэгальцаў, дык у 1917 годзе іх страты былі такія вялікія (халодны клімат яшчэ павялічваў колькасьць ахвяр на фронце), што іх становішча было мала надзейным. Адзін з іх, суданец Шэйку, паранены два разы ў Дарданэлах і ўзнагароджаны ордэнам, выкарыстаў сваю эвакуацыю ў Дакар, каб агітаваць проці службы белым. Яго за гэта паслалі на катаргу ў Гвіяну. Сярод францускіх салдат, якія засталіся ў Адэсе, у красавіку 1919 году былі таксама два сэнэгальцы.

У малгашаў, набраных такім самым чынам, як і сэнэгальцы, да канца вайны таксама стварылася група нездаволеных. Жыцьцё ў Францыі прымусіла пазнаёміцца іх з эксплёатацыяй белых. У часе саюзнай акупацыі Канстантынопалю ў пачатку 1919 году здарыўся вельмі характэрны выпадак: малгаскі ад'ютант перад усім батальёнам заявіў генэралу пратэст проці дрэнных абыходзін з асобамі яго племя. За гэта ён быў пераведзен у радавыя і кінут у астрог.

Такія прыклады налічваліся ў часе імпэрыялістычнай вайны сотнямі. Насупроць погляду імпэрыялістаў, нібыта тубыльскае войска зьяўляецца іх надзейнай зброяй, гэтыя прыклады паказваюць, што буржуазея падманіцца ў сваіх плянах, калі ўздумае пагнаць сваіх калёніяльных нявольнікаў на новую імпэрыялістычную бойню.

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна прыняў выклік.

24 ліпеня агульны сход працаўнікоў НДІ імя Леніна прыняў выклік Беларускай Акадэміі Навук аб папярэдняй падпісцы на 3-ю пазыку Індустрыялізацыі:

Сход аднагалосна пастанавіў:

Падпісацца на 3-ю пазыку Індустрыялізацыі ў памеры 150 проц. месячнага заробку.

Адначасова сход працаўніноў НДІ выклікае на спаборніцтва па падпісцы Беларускую С.-Г. Акадэмію, Беларускую Акадэмію Навук і Дасьледчыя Станцыі НКЗБ. Адлічэньні праводзіць са жніўня месяца. Лічыць неабходным утварыць фонд, шляхам спаборніцтва, на пабудову самалёту „Навуковы Працаўнік", адлічыць аднадзённы заробак і выклікаць усе навуковыя і навукова-дасьледчыя установы БССР, а таксама Мясцовы і Групковому Саюзу Працасьветы.

Адначасова сход падкрэсьліў сваю ранейшую пастанову аб калектыўнай 100 пр. здачы 2-й пазыкі Індустрыялізацыі на захоўваньне ў касу ашчаднасьці.

Для ажыцьцяўленьня паказаных пастаноў сход выбраў Камісію з 3-х асоб.

У першы дзень збору падпісі падпісаліся 44 працаўнікі з агульнага ліку 105 працаўнікоў НДІ і Балотнай Станцыі. Агульны лік падпісі 44 працаўнікоў складае 7680 руб. пры месячнай пэнсіі іх у 5148 руб.

Такім чынам, першы дзень падпісі даў 149,2 проц. месячнай пэнсіі.

5520 руб. за адзін дзень.

Рабочыя і служачыя менскай ФАБРЫКІ „ПРОГРЭСС" у адказ на выпады кітайскай вае́шчыны і сусьветнай буржуазеі разгарнулі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Папярэдняя падпіска за адзін дзень дала 5520 руб.

Падпісваюцца на 150-200 пр. заработку.

Рабочыя ШЧАЦІННАЙ ФАБРЫКІ сабралі падпіску на новую пазыку індустрыялізацыі больш як на 4000 руб. Некаторыя рабочыя падпісаліся на 150-200 проц. месячнага заработку.

Больш як на месячны заработак.

Рабочыя ПРАЦКАЛЕКТЫВУ ПЕКАРОЎ за два дні сабралі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 4500 руб. Шмат рабочых падпісваліся больш як на месячны заработак.

Лепшы адказ імпэрыялістым.

Рабочыя ПАДСОБНАЙ МАЙСТЭРНІ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА сабралі папярэдняй падпіскі на новую пазыку індустрыялізацыі на 4000 руб.

— 100 проц. месячнага заработку на пазыку—будзе лепшым адказам імпэрыялістым Кітаю,—заўважаюць рабочыя майстэрні.

Падпіска праходзіць з посьпехам.

Калектыў працаўнікоў ЦЭНТРАЛЬНАЙ СТАТЫСТЫЧНАЙ УПРАВЫ сабраў папярэдняй падпіскі на пазыку на 11800 руб. Падпіска на пазыку працягваецца.

Падпісаліся на 10.000 руб.

Калектыў працаўнікоў ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 10.000 руб.

Служачыя чыгункі не адстаюць

Служачыя ГАРАДЗКОЙ СТАНЦЫІ МБС ЧЫГУНКІ падпісаліся на новую пазыку індустрыялізацыі на 2000 руб. Падпіска працягваецца.

Папярэдняя падпіска дала 255.000 руб.

Паводле няпоўных вестак па готаўках, якія прымацаваны да Галоўнай касы ашчадкасьці, папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі дасягнула ўжо 255375 руб.

Падпісаліся на 150 проц. месячнага заработку.

Супрацоўнікі Белдзяржвыдавецтва падпісаліся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 150 проц. месячнай пэнсіі.

Кур'ер т. Воўкаў падпісаўся на пазыку на 200 проц., а рабочы кніжнай базы тав. Панцялеў—на 300 проц. месячнага заработку.

Працаўнікі Белдзяржвыдавецтва выкінулі падпісацца на пазыку ў такім-жа разьмеры калектыў працаўнікоў рэдакцыі і канторы „Зьвязда", першага Белдзяржтэатру, Наркамасьветы і выдавецтва „Чырвонай Зьмены".

* * *

Працаўнікі трэсту „ЛЕСБЕЛ" у адзін дзень сабралі падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 6000 руб.

* * *

Калектыў працаўнікоў БЕЛМЭТАЛЁТРЭСТУ папярэдня падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 4500 руб. Жаркоюць гэту суму падвоіць.

* * *

Калектыў працаўнікоў Беларускага аддзяленьня „ГЭТ" сабраў падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 4400 руб. Шмат хто з працаўнікоў падпісаўся больш чым на месячную пэнсію.

* * *

Калектыў працаўнікоў ГРУПКОМУ № 4 НАРКАМЗДРАВУ сабраў падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі больш чым на 4000 руб.

* * *

Працаўнікі АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА сабралі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на суму каля 2000 руб.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ДЗЕ БУДЗЕ ПАБУДОВАН АЎТАЗАВОД „ВОЛАТ".

МАСКВА. У Маскву вярнулася спэцыяльная камісія ВСНГ СССР на чале з начальнікам Галоўмашбуду т. Талаконцавым А. Ф., якая выяжджала ў Ніжні Ноўгарад для канчатковага выбару месца пабудовы аўтазаводу волата. Камісія падрабязна агляндзела два найбольш адпаведныя дзеля гэтага вучасткі—адзін між заводамі „Двигатель Революции" і вёскаю Манастырскаю і другі—каля вёскі Гніліцы.

Камісія канчаткова абрала месцам пабудовы заводу першы вучастак, які мае ў параўнаньні з другім некаторыя перавагі (лепшае месца ў адносінах да чыгунак і водных шляхаў і інш.). Выбар камісіі быў адобран таксама амэрыканскімі спэцыялістамі, якія ўдзельнічалі ў агляндзе вучастку. „Аўтастану" прапануецца не позьней 1-га жніўня падаць плян будаўнічай працы, каб пры атрыманьні належных крэдытаў можна было неадкладна распачаць будаўніцтва. Камісія абмяркоўвала таксама пытаньне аб прыцягненьні да тэхнічнага кіраўніцтва фірмы „Остын і К-о". Прызнана ў прынцыпе мэтазгодным прыцягнуць фірму да поўнага і адказнага кіраўніцтва будаўнічаю працаю, мантажам, абсталяваньнем і пускам заводу ў ход. Выкарыстаньне амэрыканскай тэхнічнай дапамогі павінна значна паскорыць скончэньне пабудовы заводу. Канчаткова пытаньне аб прыцягненьні фірмы будзе вырашана ў палове жніўня.

Краіна, якая мае вялікую будучыню.

БАКУ, 29-7. Амэрыканскі прафэсар Фрэд Пэджэт, які чытаў у Баку лекцыі па нафтавай справе, выехаў у Грозны. У лісьце на імя праўленьня Азнафты ён выказвае ўдзячнасьць за вроблены яму прыём і кажа: «СССР—краіна, якая мае вялічэзныя магчымасьці ў будучым, яна зрабіла на мяне вялікае ўражаньне. Убачыўшы, як працоўныя Баку імкнуцца выкарыстаць натуральныя багацьці, я магу загадзя з упэўненасьцю прадказаць вялікую будучнасьць вашай краіне». Прафэсар Пэджэт прапануе пасылаць штогоду па адным інжынэру ў Акліговскі унівэрсытэт для вывучэньня мэтадаў перапрацоўкі нафты.

Выкананьне прамфінпляну здавальняючае.

МАСКВА. Водлуг даных кан'юнктурнага бюро ВСНГ СССР, выкананьне прамфінпляну бягучага году ідзе зусім здавальняюча і абхват вытворчасьці за мінулых 9 месяцаў набліжаецца да ўзроўню, устаноўленага кантрольнымі лічбамі. Адстае ад пляну разгортваньне капітальнага будаўніцтва. Апошні час, аднак, ужыты неадкладныя захады да паскораньня працы праз пераход на 2 і 3 зьмены.

Прадстаўнікі большасьці галін прамысловасьці выказваюць упэўненасьць, што абхват будаўніцтва сёлета будзе цалкам ці амаль што цалкам выкананы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

„КРЫЛЬЯ СОВЕТОВ" АДЛЯЦЕЎ У ЛЁНДАН.

РЫМ, 29-7. Самалёт „Крылья Советов" сёньня а 7 гадз. 40 хвіл. раніцы вылецеў у Лёндан праз Марсэль.

ЗЬМЯНШЭНЬНЕ ЗАЛАТОГА ЗАПАСУ.

ЛЁНДАН, 24-7. З прычыны значных закупак волата Францыяй і Нямеччынай у ангельскім банку, залатыя запасы ангельскага банку дайшлі да мінімальных разьмераў і складаюць толькі 150 мілі

ЧЫСТКА ПАРТЫІ І САВЕЦКАГА АПАРАТУ

ЖУРАЎ І ШКІПЕР ШКОДЗІЛІ РАЗЬВІЦЬЦЮ САВЕЦКАЙ ГАСПАДАРКІ—КРАСНАЛУЦКАЯ ЯЧЭЙКА „ЗАПАМЯТАВАЛА" ПРА СЕЛЬКОРАЎ —У АРШАНСКІМ АКРСТАТБЮРО, ПА ДУМЦЫ ЗАХВАТКІНА, „ЧЫСЬЦІЦЬ НЯМА КАГО".—ЧЫСТКА Ў ПОЛАЦКУ НЕДАСТАТКОВА ЗАКРАНУЛА САМУЮ СЫСТЭМУ ПРАЦЫ ЎСТАНОЎ.

Пастанова ПК ЦКК КП(б)Б ад 24-VII-29 г.

Заслухаўшы даклады старшыні Аршанскай АКК т. Сьвірыдава і Старшыні Магілёўскай АКК т. Жолудава аб ходзе праверкі і чыстні вясковых і вайсковых ячэек на Аршанскай і Магілёўскай арганізацыях, Партканклегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прыняць да ведама, што праверка і чыстка вясковых і вайсковых ячэек у Аршанскай і Магілёўскай акругах праходзіць у большасьці арганізацый, пры дастатковым наведваньні праверачных сходаў членамі і кандыдатамі партыі, зацікаўленасьці і актыўным удзеле на гэтых сходах беспартыйнай масы: с-г. і лясных рабочых, батрацтва, беднаты, лепшай часткі серадняцтва і чырвонаармейцаў і сяброў КСМ.

2. Адзначаючы ў асноўным здавальняючае разгортваньне самакрытыкі ў час праверкі і чыстні ў тых ячэйках, дзе праведзена добрая падрыхтоўка, што садзейнічае праверкомам выяўляць маючыяся недахопы ў рабоце вясковых і вайсковых ячэек, Парткалегія ЦКК КП(б)Бел. зварочвае ўвагу, асабліва Аршанскай АКК і АК на слабую арганізаванасьць навакол праверкі і чыстні вясковых ячэек сельскораў і насьценкораў, вынікам чаго зьяўляецца слабае асьвятленьне ў друку ходу праверкі і чыстні па Аршанскай акрузе; таксама слабае асьвятленьне ў цэнтральных газэтах ходу чыстні і па Магілёўскай акрузе. Прапанаваць АКК і АК (Аршанскай і Магілёўскай) ужыць усе меры па выкананьню раней даданых ЦК і ЦКК КП(б)Б дырэктыў па гэтаму пытаньню.

3. Лічыць зусім ненармальным, што з боку кампетэнтных РК ня былі прыняты меры па растлумачэньню задач праверкі і чыстні партыі сярод батрацтва, беднаты і серадняцтва (Чачэвіцкі раён Магілёўскай акругі), адсутнасьць належнага кіраўніцтва і практычнай дапамогі ячэйкам у падрыхтоўчай рабоце да праверкі і чыстні, у выніку чаго ў шэрагу ячэек інструкцыя ЦКК УсеКП(б) і рашэньні XVI партканфэрэнцыі па пытаньнях чыстні не прапрацаваны. (Чачэвіцкі—Магілёўскай акругі, Крупскі—Аршанскай акругі), што ўскладнала работу праверкомаў.

Даручыць АКК разглядзець пытаньне аб паводзінах сакратароў гэтых Райкомаў.

4. Партканлегія ЦКК асабліва падкрэсьлівае, што ў рабоце райкомаў і ячэек, а таксама і Праверкомаў не ва ўсіх мясцох зварочаецца дастатковая ўвага пытаньням вярбоўкі ў партыю сельска-гасп. рабочых, батрацтва і беднаты. (Шклоўскі раён Магілёўскай акругі). АК і АКК праверыць выкананьне дырэктыў і аказаць практычную дапамогу Райкомам у выкананьні дырэктыў па гэтаму пытаньню, скарыстоўваючы вопыт прыкладнай работы паасобных праверкомаў па вярбоўцы ў партыю.

5. Улічваючы тое, што праверкомы ў працэсе праверкі і чыстні ячэек выяўляюць у рабоце як ячэек, так і Райкомаў многа недахопаў, галоўныя з якіх—слабая пастаноўка масавай работы ў вёсцы, слабае разгортваньне самакрытыкі ў штодзённай рабоце ячэек, у большасьці райёнаў слабае альбо поўнае адсутнічаньне работы па ўцягненню ў партыю с.-г. рабочых, батрацтва, беднаты і калгасьнікаў, зусім слабае кіраўніцтва з боку РК работай ячэек і інш.,—АК і АКК прыняць неадкладныя меры да рэалізацыі вынікаў праверкі і чыстні партыі з мэтай зьліквідаваньня адзначаных недахопаў і палепшаньня працы вясковых ячэек.

6. Адзначаючы неналаджанасьць як у Магілёўскай, так і, асабліва, у Аршанскай акрузе, распрацоўкі статыстычных даных па райёнам і акрузе, і напрысылку іх да гэтага часу ў ЦКК КП(б)Бел., катэгарычна прапанаваць АКК і АК наладзіць гэту работу і ў далейшым прысылаць па ўстаноўленым формам весткі ЦКК УсеКП(б), ЦК і ЦКК КП(б)Б да 1-15 кожнага месяца.

7. Маючы на ўвазе наступіўшыя летнія работы ў вёсцы, што можа адбіцца на масавасьці праверачных сходаў, Парткалегія ЦКК КП(б)Б прапануе АК, АКК і РК прыняць усе меры па забесьпячэньню і ў далейшым наведваньня і актыўнага ўдзелу с-г. рабочых, батрацтва, беднаты і серадняцтва ў час праверкі і чыстні вясковых ячэек.

Разам з гэтым АК і АКК прыступіць да праверкі падрыхтаванасьці да чыстні савецкіх ячэек і ячэек навучальных устаноў.

8. Улічваючы, што ў шэрагу праверкомаў маюць мейсца фанты слабага вывучэньня (ці поўная адсутнасьць) матываў палітычнай актыўнасьці ў садзейнічаньні чыстцы паасобных клясавых праслоек у вёсцы, а ў паасобных выпадках ня прымаюцца меры да таго, каб шырокае садзейнічаньне чыстцы ваўзлаўлялася арганізуемым партыяй батрацтвам і беднатой супроць кулацкіх, клясава-варожых сіл вёскі,—прапанаваць усім АКК паставіць гэту задачу ў падставу работы праверкомаў шляхам шырачэйшай папярэдняй работы па прыцягненню да чыстні перш за ўсё батрацтва і беднаты, устанавіць вучот прысутнічаючых на сходах, па чыстцы і выступаючых на іх па сацыяльных азнаках (батраки, бядняк, серадняк), ацэньваючы палітычныя выніні і якасьць праверкі па сапраўдным дасягненьням чыстні ў справе прыцягненьня батрацтва і беднаты і ўцягненьня ў партыю іх.

Замест нягодных—новыя сілы.

Больш тыдню працавала кахісія па праверцы ячэйкі палкавой школы № полка.

На сходзе, дзе прысутнічае ўвесь склад школы, старшыня камісі т. Бягун абвяшчае вынікі праверкі:

З усіх праверваных з партыі выключана 4. Сярод выключаных сакратар ячэйкі, які ў вайсковым будаўніцтве не праводзіў лініі партыі.

Ячэйка на чале з выключаным сэкратаром прабавала адміністраваць, не дапамагала начскладу ў рабоце па ўзмацненьні дысцыпліны, было праціпастаўленьне партыйцаў радавым—партыйцам з начскладу. Гэта перашкаджала ўзмацненьню баяздольнасьці. Астатнія 3 выключаны за недысцыплінаванасьць, няпрыкладнасьць і адзін за захаваньне судзімасьці.

4 таварышы атрымалі партыйныя пакараньні.

Праверка дала вразумець, што той, хто не дапамагае ўзмацненьню баяздольнасьці Чырвонай арміі,—не павінен быць у шэрагах партыі.

На гэтым-жа сходзе пасьля абвяшчэньня вынікаў пачаўся прыём у партыю.

Першым ідзе т. Юркевіч, рабочы, курсант школы.

Прыкладны таварыш—аднагалосна адказваюць курсанты.

Тав. Панцялеяў і Марыніч, курсанты-калгасьнікі. Бацька аднаго ў калгасе з 1924 г., другога—з 1926 г. Прыкладныя курсанты, актыўныя таварышы. Будуць добрымі малодшымі камандзірамі і партыйцамі.

Тав. Цішкевіч і Секацкі—сяляне. Адзін бядняк, другі серадняк.

Замест выключаных няздольных ажыцьцёвіць задачы, прынятыя 5—здольныя праводзіць клясавую лінію.

С. К.

„У нас чысьціць няма каго".

Матад чысткі аршанскага акрстатбюро быў такім самым, як і ва ўсіх ачышчаючыхся ад «скверны» установах. Пачалася чыстка агульным сходам, дакладам кіраўніка ўстановы і садакладам рабочай брыгады.

Даклад кіраўніка-загадчыка Акрстатбюро т. Захваткіна быў цалкам пабудаван на «глыбока навуковых і гістарычных" ісьследаваньнях пытаньня аб статыстыцы.

Тав. Захваткін не запамятаваў успамянуць і пункт погляду на статыстыку вялікага паэты „зямлі рускай" Пушкіна. Не прамінуў ён і прадстаўнікоў клясычнай школы палітэканоміі XVIII веку.

Скончыў свой даклад т. Захваткін лічбамі, вялікімі і малымі, аб становішчы Аршаншчыны.

Але для прысутнічаўшых на сходзе гэтага ўсяго паказалася мала. Бачыце, т. Захваткін запамятаваў, што ён павінен быў рабіць даклад не аб гістарычным значэньні статыстыкі, а аб становішчы кіруемага ім статыстычнага бюро.

Толькі пасьля таго, як нехта палахліва намякнуў на тое, што сходы цікава было-б знаць грамадзкі твар працаўнікоў статбюро і іх прыгоднасьць да працы, т. Захваткін аўтарытэтна заявіў:

— У нас усе на мейсцы, працуюць добра, штат падабраны,—адным словам, у статбюро няма каго чысьціць, а пагэтаму навошта траціць час на такую некарысную працу, як чыстка статбюро.

Але камісія па чыстцы ўсё-ж такі працу пачала.

Першым перад ёй „предстал" сам т. Захваткін і аказалася, што чысьціць статбюро ўсё такі патрэбна, што гэта трэба зрабіць з галавы ўстановы. Тая характырыстыка, якую далі супрацоўнікі Захваткіну, кажа аб тым, што Захваткіна можна скарыстаць усюды, дзе толькі ёсьць патрэба, але толькі не на адміністрацыйнай рабоце ў савецкіх установах.

Самакрытыка ў статбюро была на вадворках. Адно толькі жаданьне крытыкаваць, даводзіла да таго, што пры першым скарачэньні штатаў, у сьпіскі звальняемых уносіліся крытыкі, „не взирая на лица» будзь то дзелавод альбо загадчык сэкцыі.

Чыстка таксама выявіла, што дзякуючы нераспарадчасьці, у статбюро расьлі і квітнелі звышнаромовыя работы і „чинопочитание".

Сам загадчык Захваткін, таксама браў сабе працу на дом, каб крыху зарабіць, але выконваў гэту работу ў службовыя часы.

Таварыш Захваткін—вялікі аматар падарожжа. Асабліва ён любіў езьдзіць у тыя раёны, дзе райстатыстыкі-жанчыны і, у дадатак да гэтага, удовушкі. Тады камандыровачкі сыпаліся вельмі часта.

Чыстка яшчэ ня скончылася. Вынікаў яшчэ няма. Ня будзем і мы забягаць наперад камісіі. Пачакаем. Камісія скажа, ці патрэбна чысьціць статбюро ці не. Ці ўсе тут на мейсцы і добра працуюць ці не.

Але што небудзь і цяпер можна сказаць, асабліва аб тым, што аздаравіць статбюро прыдзецца абавязкова.

А. Калюжны.

Два „працаўнічкі".

Бываюць гаспадарнікі савгасаў добрыя, энэргічныя, уся іх праца накіроўваецца на тое, каб лепш палепшыць і хутчэй разьвіваць калгас гэтак сама і дапамагаюць у правядзеньні новых мерапрыёмстваў у вёсцы, але побач з гэтымі ёсьць і такія, якія ня толькі дапамагаюць, а шкодзяць. Адным з такіх зьявіўся загадчык савгаса Слабады—Жураў.

Жураў, зьяўляючыся загадчыкам савгасу, свае правы скарыстоўваў на тое, каб свой дзень запоўніць, а як пойдзе праца—не яго справа. За час сваёй працы ўцягнуў у кампанію па выпіўцы, старшыню рабачкому Шкіпера і інш., у выніку яго працы атрымалася тое, што пала вытворчасьць працы савгаса, гэтак і ўплыў савгаса на акаляючае сялянства.

Патрэбна зазначыць, што таксама ня працаваў і старшыня рабачкому Шкіпер, ніякай працы не праводзілася па выхаваньню і наогул па прафпрацы.

Рабочыя савгасу, абмяркоўваючыя пытаньне аб становішчы савгасу выказываліся, што як Жураў, гэтак і Шкіпер ніяк не дапамагалі разьвіцьцю савецкай гаспадаркі, а толькі шкодзілі і што гэтакіх з працы патрэбна зьняць.

Пытаньнем над палепшэньнем працы ў савгасе заняліся. Зараз зьнят і перададзены судовым органам загадчык савгасу Жураў, ён таксама выключан з саюзу, зьнят з працы маслаадзел за сыстэматычную п'янку, распутнасьць і выключан Кавальчук з саюзу, распушчан рабачком, зьнят з працы старшыня рабачкому Шкіпер і выключан з саюзу.

Рабкорка.

Працоўнае насельніцтва дапамагае партыі ў чыстцы.

(Красналуцкая яч. КП(б)Б, Халопеніцкага райёну).

Ішлі за 10 вёрст.

З 3-га па 6-е ліпеня г-г праверачная камісія праводзіла чыстку Красналуцкай ячэйкі КП(б)Б.

За два дні камісія накіравала прадстаўніка Райкому КП(б)Б для падрыхтоўкі як самой ячэйкі, так і насельніцтва.

Было праведзена 9 сходаў па буйным населеным пунктам сельсавету, асабліва сярод беднаты і батрацтва з пытаньнем аб выніках XVI партканфэрэнцыі і чыстцы партыі і савецкага апарату.

Камсамольцы і частка піанэраў былі скарыстаны дзеля разноскі 100 запрашальных позваў ад імя камісіі. Ячэйка вяла працу па чыстцы, але недастаткова, некаторыя вёскі зусім ня ведалі.

Ячэйка не дагадалася склікаць на нараду селькораў і сьценкораў, на запытаньне камісіі: „Чаму ня выпушчана сьценгазэта і чаму ня выпісан артыкул у сьценгазэце аб чыстцы партыі?" быў адзен адказ, што „некаму пісаць і няма аб чым пісаць". З прычыны чаго ход падрыхтоўкі і чысткі ў друку ня асьвятляўся. Гэта тармазіла працу камісіі, якая чакала, што ячэйка, селькоры і сьценкоры прымуць шчыры ўдзел і дапамогуць камісіі працаваць.

Ня гледзячы на дрэнную падрыхтоўку з боку ячэйкі, усё-ж насельніцтва дапамагала, асабліва беднота, батракі і саматужнікі.

Працоўнае насельніцтва ішло за 10-12 вёрст дапамагчы камісіі ў працы.

Ход праверкі.

У першы дзень каля хаты-чытальні сядзелі сяляне і сялянкі. „Скора лі пачнецца гэта чыстка"—пыталіся яны адзін у другога.

Радам сядзеўшы сусед з насьмешкай адказаў:

„Няхай падрамантуюць трыер, каб добра чысьціў".

Старшыня праверачнай камісіі зрабіў даклад аб чарговых задачах партыі і ўдзелу працоўных па праверцы і чыстцы шэрагаў партыі.

Сэкратар ячэйкі зрабіў справаздачу аб працы ячэйкі. Па дакладу было задана 22 пытаньні, у спрэчках выступіла 12 таварышоў, якія больш усяго адзначалі недахопы ў працы ячэйкі і асобных таварышоў-партыйцаў. Частка партыйцаў не згаджалася з маючымися недахопамі ў працы, другія стараліся самі сябе хваліць, што ў іх усё добра.

На запытаньне старшыні камісіі тав. Блоўштэйна: „колькі ў вас арганізавана калгасаў?"—быў адказ: „усё рабілі, гэта залежыць ад вышэйшых органаў".

Правяраецца тав. Вашкевіч Якаў—член партыі з 1926 году, беларус, служачы-земляўпарадкавацель, працуе 4 год. Вытрыманы, аўтарытэтны. Агітуе за калгасы.

— Трэба заставіць у партыі,—чуюцца выгукі.

Далей—тав. Казан Антось. Член КП(б)Б з 1928 г. Сакратар ячэйкі. Скончыў савпартшколу, загадчык хаты-чытальні. За халатныя адносіны да правядзеньня падрыхтоўкі к чыстцы партыі і начоткага кіраўніцтва ў працы партячэйкі абвешчана вымова.

Макарэнка Іван. Канд. КП(б)Б з 1927 г., працуе на сваёй гаспадарцы, за адарванасьць ад партячэйкі, за невыкананьне партдырэктыў, няўплаты сяброўскіх узносаў за цэлы год, праяўленьне хуліганства ў п'яным відзе, непадаючага спраўленьню выключан з шэрагаў КП(б)Б.

Сэрафімовіч Іван—член КП(б)Б 1928 году, селянін, у сучасны момант працуе лясьніком, за грубыя адносіны к насельніцтву і выпіўку абвешчана вымова.

Сяргун Міхась—член КП(б)Б 1928 г., селянін, быў у пляну ў Нямеччыне, выдвіжэнец працуе старшынёй С.-Г. Кр. Т-ва. За грубыя адносіны да насельніцтва пастаўлена на від.

Тав. Качэнка Зьмітра, сябра КП(б)Б з 1926 г., селянін, працуе загадчыкам С.-Г. Т-ва. За скарыстаньне службовага становішча бяз згоды праўленьня—абвешчана вымова.

На працягу 3-х дзён праверана 10 таварышоў, выключан 1,—прыцягнута да партспагнаньня—4 таварышы, за 3 дні на сходзе прысутнічала каля 800 чал. Трэба адзначыць, што беспартыйныя рабочыя і батракі, беднякі і сераднякі плялі на сход дапамагчы праверачнай камісіі выявіць твар кожнага партыйца і ацаніць яго працу. Другая частка падкулачнікаў усялякімі мерамі стараліся загразьніць таварышоў, якія праводзілі клясавую лінію партыі і абаранялі інтарэсы беднаты.

Будзько С. А.

Вынікі чысткі савецкіх устаноў.

(Г. Полацак).

На 15-е ліпеня па Полацку скончылася работа па чыстцы Акрдзяржстраху, Сельбанку, Дзяржбанку, Акрсуду і Пракуратуры.

Прайшоўшая чыстка недастатна закранула самую работу і сыстэму ў працы гэтых устаноў, за выключэньнем аддзяленьня Дзяржбанку.

Праўда, па гэтых установах было канстатавана пры правядзеньні праверкі шэраг момантаў, наводзячых у аспэўным на думку аб неналаджанасьці работы апарату, але факты—звычайна высьвятляліся выключна па лініі таго, каб устанавіць толькі вінаватасьць тэй ці іншай асобы, ня зьвязвая яе з парадкам работы ўстановы.

У Дзяржбанку, калі падышлі глыбей да злоўжываньня былога бухгальтара, дык высьветлілася яшчэ цэлая гара розных недарэчнасьцяй і недахопаў у апараце. Пачалі разьбірацца і ўстанавілі, што дзякуючы няўмеламу кіраўніцтву апаратам, несвачасоваму рэагаваньню на асобныя факты, расла магчымасьць усё большага разлажэньня апарату. Пры чыстцы выявілася падзеньне працоўнай дысцыпліны, бескантрольнае, бяссыстэмнае выдаткоўваньне сродкаў на розныя выдаткі, неправіловасьць у разьмеркаваньні працы сярод працаўнікоў і інш. Гэта было ўскрыта дзякуючы таму, што тройка садзейнічаньня, а таксама камісія не абмяжоўваліся фактамі толькі бухгальтара, але заглянулі „за кулісы" і ў сталы працаўнікоў.

У астатніх-жа ўстановах так перабраць усю працу ўстановы не давялося, бо самы падыход агляду работы троек садзейнічаньня меў надта афіцыйны характар.

Трэба падкрэсьліць, што існавалі настроі неправідловага паразуменьня чысткі з боку работнікаў апарату, погляд, што нас будуць чысьціць, таму мы павінны моўча прадстаць і чакаць сваёй чаргі—прывялі к таму, што выступленьні на сходах мелі надзвычайна вузкі характар, выступленьні звычайна рабіліся 3-5 чалав. на сходзе, якія падтрымлівалі „актыўнасьць".

З яўкаю на сходы таксама абстаяла ня зусім добра: на ўсіх сходах пры правядзеньні чысткі было максімальнаю лічбаю 70-80 чалавек, пры зусім слабым процанце ўдзелу рабочых з прадпрыемстваў.

Прафорганы і іх зьвяньні не з дастатковай увагай аднесьліся к правядзеньню самой работы па чыстцы. Нават шэраг савецкіх органаў ня зусім прыхільна іншлі на сустрэчу і дапамогу ў рабоце камісій, асобным камісіям прыходзілася па два разы ў дзень пераносіць паседжаньні, што вельмі адзначалася на лічбе ўдзельнікаў.

Л. Ч.

„Трукі" Дубовіка

(Менская акруга).

Раней, калі Дубовік працаваў дзелаводам лесзага акрза, дык ён меў магчымасьць мець адміністрацыйныя правы, падмяняючы часта адміністрацыю у звальненьні тэхнэрсаналу, карыстаючыся давер'ем адміністрацыі, ён прымушаў супрацоўніц акрза мець з ім інтымныя сувязі. Гора бачыла тая супрацоўніца, якая адмаўлялася пайсьці з ім гуляць: ён такіх супрацоўніц стараўся зараз-жа ўбраць з установы, такія прыклады былі ўжо.

Да гэтай асобы патрэбна ня толькі чыстка, але і пракурорская рука, якая прыцягне да судовай адказнасьці.

Пад.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

27 ліпеня 1929 г. пад старшынствам тав. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разгледжаны былі наступныя пытаньні:

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПЕРАПАДРЫХТОЎЦЫ НІЗАВЫХ САВЕЦКІХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

Заслуханы: а) даклад Аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы нізавых савецкіх працаўнікоў БССР і аб ходзе гэтай працы і б) садаклад Менскага АВК па гэтым пытаньні ў адносінах Менскай акругі.

У час перавыбарнай кампаніі г. г. увесь склад нізавых саветаў адноўлен на 70 проц. і склад сталых працаўнікоў (старшынь і сэкратароў)—на 35 проц. У зьвязку з гэтым, пытаньне падрыхтоўкі працаўнікоў саветаў набывае вялікае значэньне. Аргаддзелам распрацавана схэма курсаў: каротка-тэрміновыя курсы—нарады (3-хдзённыя), праз якія павінны быць прапушчаны ўсе сябры саветаў; каротка-тэрміновыя (трохдзённыя) курсы пры райёнах для старшынь і сэкратароў сельсаветаў. і асобна такія-жа курсы для старшынь і сэкратароў саветаў-жанчын; месячныя альбо паўтарамесячныя курсы пры акругах для старшынь і сэкратароў сельсаветаў з разьліку па 60 чалавек на акругу, цэнтральныя курсы для старшынь і сэкратароў саветаў—жанчын, і такія-жа курсы для работнікаў нацыянальных саветаў. Уся праца па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы работнікаў нізавога савецкага апарату павінна быць праведзена і падагулена па БССР да кастрычніка месяца. Згодна даных, якія маюцца, кароткатэрміновыя курсы-нарады ў пераважнай колькасьці саветаў і райёнаў ужо праведзены; некаторыя акругі нават замест райённых трохдзённых курсаў-нарад правялі двухтыднёвыя курсы-нарады. Акруговыя курсы часткова ўжо праведзены, а ў некаторых акругах зараз праходзяць. Добра праведзены курсы па Віцебскай акрузе, дзе акруговымі курсамі ахоплен амаль увесь склад сталых працаўнікоў саветаў. Здавальняюча праходзіць гэта праца і ў іншых акругах (Гомель, Бабруйск, Орша, Полацак).

Дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай работнікаў саветаў па Магілёўскай і Мазырскай акругах; па Менскай акрузе таксама яшчэ ня прыступлена да правядзеньня акруговых курсаў, каротка-тэрміновыя-жа курсы-нарады пры саветах і райёнах Меншчыны зараз праводзяцца. У гор. Менску зараз праводзяцца цэнтральныя курсы сталых работнікаў саветаў—жанчын, цэнтральныя курсы працаўнікоў нацыянальных саветаў склікаюцца з 1 жніўня.

Прэзыдыум ЦВК па заслуханым дакладзе адзначыў, што схэма курсаў, іх праграма і зьмест вучэбных плянаў, якія вызначаны, забясьпечваюць ахват усяго складу нізавых саветаў, а таксама даюць работнікам саветаў неабходныя веды для іх дзейнасьці ў савеце. Магілёўскаму і Мазырскаму акрвыканкомам, якія недаацанілі важнасьць пытаньня перападрыхтоўкі выбарных работнікаў саветаў, прапанавана абавязкова зараз-жа прыступіць да арганізацыі гэтай працы. Аргаддзелу даручана прасачыць за выкананьнем усімі акрвыканкомамі дырэктыў Прэзыдыуму ЦВК аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы нізавых работнікаў саветаў.

АБ ПАСТУПОВЫМ УВЯДЗЕНЬНІ САМАСТОЙНЫХ БЮДЖЭТАЎ ВА ЎСІХ СЕЛЬСКІХ САВЕТАХ БССР

Прэзыдыум ЦВК прыняў да ведама паведамленьне Наркамфіну БССР аб тым, што ім у адпаведнасьці з даручэньнем Прэзыдыуму ЦВК БССР, распрацаван і пададзен у Дзяржплян плян паступовага ўвядзеньня самастойных бюджэтаў ва ўсіх сельскіх саветах БССР, і даручыў СНК разгледзіць гэты плян па сутнасьці.

АБ ВЫНІКАХ УЖЫВАНЬНЯ Ў БССР КОДЭКСУ ЗАКОНАЎ АБ ЛЬГОТАХ І ПЕРАВАГАХ ДЛЯ ВАЙСКОВА-СЛУЖАЧЫХ І ІХ СЯМЕЙ.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў заслухаць праз тры тыдні даклад Наркам. РСІ і Аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР аб выніках ужываньня ў БССР Кодэксу Законаў аб льготах і перавагах для вайскова-служачых РСЧА і РСЧФ СССР і іх сем'яў.

Менскаму, Віцебскаму, Бабруйскаму, Аршанскаму і Мазырскаму акрвыканкомам катэгарычна прапанована тэрмінова падаць падагуленыя вынікі ўжываньня паказанага Кодэксу аб льготах па іх акругах і разам з гэтым таксама даць тлумачэньне аб прычынах непадачы неабходных матар'ялаў да гэтага часу, ня гледзячы на дырэктывы Прэзыдыуму ЦВК.

КОДЭКС ЗАКОНАЎ АБ ПРАЦЫ БССР.

Зацьверджан Кодэкс Законаў аб працы БССР. У гэтым Кодэксе сканцэнтравана ўсё законадаўства БССР аб працы, а таксама ўнесены тыя папраўкі, якія вынікаюць у зьвязку з законадаўствам Саюзу ССР. Дапоўнен новым абзацам аркыкул 132 Кодэксу. Да гэтага году 132 артыкулам быў прадугледжан час вызваленьня жанчыны ад працы па цяжарнасьці толькі пры нармальных радох, але ня быў вызначаны час вызваленьня ад працы жанчыны пры дачасных радох (пачынаючы з 5-га месяца цяжарнасьці).

У апошняй-жа рэдакцыі 132 арт. паказана, што Наркампрацы і Наркамаховы Здароў'я па згодзе з ЦСПСБ павінен быць устаноўлен таксама час вызваленьня жанчын ад працы і ў паказаным выпадку.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў пасьля разгляду гэтага пытаньня НКПрацы, Наркамаховы Здароўя і ЦСПС, перадаць яго на папярэдняе шырокае абгаварэньне жанчын-работніц.

АБ ЗАПАТРАБАВАНЬНЯХ БЕЛАРУСКІХ ПІАНЭРАЎ.

Прэзыдыум ЦВК, заслухаўшы запатрабаваньні беларускіх піанэраў „Нашы запатрабаваньні да Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларусі" (газэта „Чырвоная Зьмена" ад 26 ліпеня 1929 г., № 167), пастанавіў даручыць Камітэту Садзейнічаньня правядзеньню Ўсебеларускага зьлёту піанэраў пры Прэзыдыуме ЦВК БССР і Вышэйшаму Савету фізычнае культуры разгледзіць запатрабаваньні піанэраў і свае прапановы падаць на абгаварэньне Прэзыдыуму ЦВК.

АБ ПАПАЎНЕНЬНІ СКЛАДУ ВЫШЭЙШАГА САВЕТУ ФІЗЫЧНАЕ КУЛЬТУРЫ БССР.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў зацьвердзіць Члена Прэзыдыуму ЦВК БССР—Камандуючага войскамі БВА тав. Ягорава Членам Вышэйшага Савету фізычнае культуры БССР.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ МЕНСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ СУПРОЦЬ ВАЙНЫ.

(На карнавале 28-га ліпеня).

Вайна—вайне.

Прыгожы ліпнёвы дзень. Каля клюбу Карла Маркса вялікі натоўп. Кожнаму хочацца стаць наперадзе, каб лепш убачыць карнавал, а паглядзець было што...

Мопраўскі карнавал вельмі ўдаўся.

На чале карнавалу—1914 год, год пачатку вялізарнай імпэрыялістычнай бойні... Жудаснай бойні, якая каштавала чалавецтву 10 мільёнаў забітых, звыш 21 мільёна параненых і калек, на 495 мільярдаў рублёў страт і разбурэньня...

Лічбы, ад якіх валасы становяцца дыбам...

Імпэрыялістычная вайна паглынула працу многіх пакаленьняў працоўных, яна прынесла ім нябывалыя мукі...

Іменна на плечы працоўных лягла ўсё найвялікшыя цяжкасьці імпэрыялістычнай бойні, на долю іх прыпадае 99 проц. ахвяр, на іх лёг і ўвесь цяжар разбурэньня, выдаткаў на вайну, усіх матар'яльных страт...



Вось на чым трымаўся царызм.

Віноўнік гэтай бойні—капітал—рухаецца ў калёне карнавалу на буйнай гармаце, а за ім чырвоныя сёстры на насілках нясуць ахвяры вайны: цягнуцца пакалечаныя людзі...

У калёне 1914 году едзе грузавік з вялікім тронам з фанэры, а на ім крывавы Мікалай II...

1917 год... Досыць было добрага штуршка рабочых — і трон разьляцеўся, як картачны домік, а з ім паляцеў—крывавы імпэратар і ўжо ня ўстане.

Лютаўская рэвалюцыя не здаволіла пралетарыят. Капітал і буржуазея пры дапамозе сацыял-згоднікаў узялі ўладу ў свае рукі... Для рабочых ланцугі абсалютызму зьмяніліся на ня менш моцныя ланцугі капіталістаў, якім падпявалі Керанскія, Чарновы і іншыя „блюдалізы» буржуазеі...

— Вайна да пераможнага канца,—лёзунг Мілюковых, Рабушынскіх і Кераншчыны, пралетарыят пад кіраўніцтвам свайго вялікага правадыра Леніна, замяніў, лёзунгамі:

— Прэч вайну!..

...Уся ўлада Саветам!..

Лёзунгі, з якімі пралетарыят «дэмакратычнай Расеі вышаў на барыкады ў Кастрычніку 1917 году...

Паўсталі працоўныя гораду і вёскі, у барацьбе з буржуазеяй аб'ядналіся працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяў. З вінтоўкамі, косамі і сярпамі працоўныя звалілі царства капіталу, а разам з ім і яго „блюдолизов"...

Пачалася грамадзянская вайна...

Галодныя, голыя рабочыя і сяляне, пад кіраўніцтвам партыі пралетарыяту адстаялі заваёвы вялікага Кастрычніка...

Ахвяр таксама шмат, але яны не даремны... Мы жывём і будуем сацыялізм у адзінай у сьвеце краіне працоўных...

Наш энтузіязм, наша дзяржаўнае будаўніцтва захапляе рабочых усяго сьвету.

Рабочыя масы, працоўнае сялянсва ўсіх імпэрыялістычных дзяржаў усё сьмялей і сьмялей падымаюць свой голас. Аддзіная партыя пралетарыяту—камуністычная ў буржуазных краінах расьце з кожным днём і з кожным месяцам. Пралетарыят гэтых краін рэвалюцыянізуецца ўсё больш. Ужо пачаліся клясавыя бойкі, а таму...

Дзесяткі тысяч рэвалюцыйных рабочых і сялян буржуазея кідае ў капіталістычныя турмы, тысячы, вялікія тысячы рэвалюцыянэраў буржуазея насылае на шыбеніцы, засуджвае на растрэл...

Калёна ячэек Мопру ў лічбах і плякатах яскрава паказвае працоўным Менску, што робіць усясьветная буржуазея з перадавымі рабочымі сваіх краін...

Малюнак жудасны...

Кожнае дасягненьне краіны саветаў—гэта новы асінавы кол у грудзі усясьветнаму капіталу. Яму не да густу шапрычыне вайны.

1917 г. Прыслужнікі буржуазеі—Керанскі, генэралы, папы, здраднікі, пяталізы, лёкаі ўсясьветнай буржуазеі.

Далей, далей... Але што гэта? Чуцен трывожны заклік—сыгнал да змаганьня з сусьветным дармаедам—з гідраю контр-рэвалюцыі...

— „Вайна—вайне", „Уся ўлада Саветам"—вось агнявы заклік таварыша Леніна ў Расеі, Карла Лібкнэхта—у Нямеччыне... Кастрычнік... Ура, таварышы, будзем стойкі—бяз хістаньня—мы пераможам!..

І міліёны працоўных «прагналі з зямлі палачоў» — ідзе пераможная Чырвоная армія—„Ура, Ура! Няхай жыве і мацнее наша Чырвоная армія! Сьмерць буржуазеі!".

К.



МОПР нясе дапамогу салдатам рэвалюцыі.

Мы будзем цьвёрды і пераможам

1914 г., пракляты год у гісторыі чалавецтва, крывавы 1914 г.! На карнавале ён быў прадстаўлены так: чатыры змучаныя да сьмерці салдаты розных перадваенных імпэрыялістычных дзяржаў нясьлі на палках людзкія чарапы—сымбаль 1914 г. За імі малюнак—«Каму патрэбна вайна»; на дулах гармат пабудаваны трон, на якім сядзіць „па вышыні свае нікчэмнасьці"—плюгавы Мікалай Крывавы. За ім на штыках салдаты старой расейскай арміі нясуць трафэі свае перамогі... горы трупаў і касьцей. І тут лічбы, жахлівы балянс імпэрыялістычнай бойні...

— Пракляцьце ўсясьветнаму імпэрыялізму, пракляцьце крываваму, агідкаму капіталізму—зачынчыку і перасіканьне першай у сьвеце рэспублікі саветаў, і імпэрыялісты імкнуцца задушыць нас, вярнуць нам зноў капіталістаў і памешчыкаў.

Мы жадаем мірна працаваць, жадаем у мірных умовах будаваць сацыялізм.

Мы ня хочам вайны. Але калі капіталісты нападуць на нас, рабочыя і ўсё працоўнае насельніцтва як адзін паўстане на абарону сваіх вялікіх заваёў.

Аб гэтым ён скажа імпэрыялістам у дзень 1-га жніўня...

В. Зайцаў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ПРАЦА ТРЫЛЕСІНСКАЙ МАЛОЧНАЙ АРЦЕЛІ

У Трылесіне, Дрыбінскага райёну існуе малочная арцель. Старшынёй праўленьня гэтай арцелі з пачатку яе арганізацыі да апошняга часу зьяўляецца нейкі Вагеніс з „быўшых людзей". Вядома, што такім каапэратарам няма ніякай справы да нашага сацыялістычнага будаўніцтва і ўся іх думка накіравана на тое, каб усялякімі мерамі садзейнічаць кулацкім колам вёскі. Зроблены саюзам інструктарскі агляд знайшоў цэлы шэраг недахопаў і злачынстваў, як у сэнсе ўсяе гаспадарчай працы т-ва, так і ў парушэньні клясавай лініі пры разьмеркаваньні канцэптрыраваных кармоў для жывёлы.

Праца на каапэрыраваньню насельніцт

ПЕРАД БУЛЬБАЙ—ВЯЛІКАЯ БУДУЧЫНЯ.

Трэба памятаць, што падвоіць ураджай бульбы—не фантазія агранамаў і ня выдумка спэцыялістаў, а рэальная для БССР рэч. Па тысячы пуд. бульбы з дзес. мы ўжо зьбіраем у некаторых савгасах і сялянскіх гаспадарках і не таму, што там лепшая зямля. Чаму-ж не дасягнуць гэтага па ўсёй БССР? Цэнтральная Бульбяная Станцыя БССР дае адказ на гэтае пытаньне.

Вы, напэўна, ня ведаеце што знаходзіцца ў Вялікай Сьляпянцы, у трох кілёмэтрах ад беларускай сталіцы? Не зацікавіліся ведаць аб гэтым? Шкада. Даўно ўжо час больш чым ведаць аб В.-Сьляпянцы. Ня толькі ведаць, але і расказаць аб гэтым селяніну, усёй беларускай вёсцы, ад ваколіц Менску і да Суслаўкі, што за восемдзесят кілёмэтраў ад Воршы. А ў першую чаргу трэба ведаць аб Цэнтральнай Бульбянай Станцыі Навукова - Дасьледчага Інстытуту Беларусі ўсім агранамам рэспублікі. Менавіта яны павінны зьявіцца папулярызатарамі працы станцыі: менавіта яны павінны ўзяць сабе ў дапамогу ўсіх сялян-дасьледчыкаў і актыў вёскі, аб'яднаны сельска-гаспадарчымі гурткамі.

„Чортава яблыка" ў эканоміцы Беларусі

„Чортава яблыка", прывезена калісьці з Паўднёвай Амэрыкі, адыгрывае кіруючую ролю ў інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі. Зараз мы з ухмылкай на вуснах успамінаем часы Пятра I і Кацярыны II, калі сяляне ўздымалі «бульбяныя бунты» супроць нячыстай сілы, якая сядзіць у „Чортавым яблыку". Пасеў бульбы з году ў год павялічваецца, займае паступова ўзрастаючае месца ў эканоміцы Беларусі. Гэта можна прасачыць на лічбах (процанты паказваюць плошчу зямлі, якую займае бульба ў адносінах да ўсіх іншых культур—жыта, ячмень, авёс, грэчка і г. д.):

1916 г.—8,8 проц., 1920-21 г.—9,5 проц., 1924 г.—11,3 проц., 1925 г.—12,1 проц., 1926 г.—13,0 пр., 1927 г.—13,5 проц.

Такім чынам, плошча зямлі, якую займае бульба, з кожным годам павялічваецца. У мінулым годзе і ў гэтым плошча яе, бязумоўна, павялічылася, але мы ня маем аб гэтым належных вестак. А раз павялічваецца пасевы бульбы, дык у селяніна зьяўляецца магчымасьць трымаць больш жывёлы, зьяўляецца магчымасьць атрымаць больш вялікшую колькасьць гною, ды і сама бульба добра падрыхтоўвае глебу для іншых культур, якія засяваюцца пасьля яе.

Пасеў бульбы значна павялічвае прыбытковасьць адзінкі плошчы. Калі напрыклад, ураджай пшаніцы, жыта, аўса з гэктара каштуе 150 руб., то ўраджай бульбы будзе ў два-тры разы даражэй—300-450 руб.

Праўда, каля бульбы трэба больш працаваць, трэба затраціць большую колькасьць рабочай сілы, чым каля іншых культур, але гэта, як кажуць, „вернецца старыцаю". Ды к таму-ж пашырэньне пасеву бульбы дасьць магчымасьць ліквідаваць некаторай часткі аграперанаселенасьць нашай беларускай вёскі, дасьць магчымасьць ліквідаваць беспрацоўе, „лішнія рукі", якіх яшчэ многа ў вёсцы. Замест таго, каб шукаць заработку ў іншым месцы, можна з вялікім посьпехам заняцца разьвядзеньнем бульбы, якая апраўдае працу.

У вялікай карысьці бульбы можна ўпэўніцца хоць-бы па той буйнай суме прыбытку, які яна дае дзяржаве*). У 1896—1900 г.г. прыбытак ад бульбы быў у Віцебскай, Магілёўскай і Менскай губ.—17,9 мільёнаў руб., а ў 1909—1913 г.г. амаль ня ў два разы больш—31,6 мільён. руб. за 1911—15 г.г. агульны прыбытак ад бульбы на сучаснай БССР быў 34,2 млн. руб., за 1924-25 г.г. 39,4 млн. р. і ў 1930—31 г.г. павінен быць 77,3 млн. руб. За трыццаць год нацыянальны прыбытак ад бульбы павялічваецца ў чатыры з паловай разы.

Надта вялікае значэньне мае бульба ў сэнсе сувязі гораду з вёскай, рабочага з селянінам. Да вайны ў Беларусі было каля 400 заводаў па перапрацоўцы бульбы, з якіх амаль што ўсе былі броварнымі—выпрацоўвалі гарэлку, самы выгадны і самы шкодны прадукт. Вядома, мы не маглі пайсьці па такому шляху. Зараз у нас працуюць 65 броварных і 26 крахмальных заводаў. У пяцігодцы прадугледжана, што ў 1932 г. мы павінны мець сетку бульбаапрацоўчых заводаў у такім разьліку, каб завод ад заводу знаходзіўся на адлегласьці ад 10 да 30 вёрст. Такім чынам, мы будзем мець 73 броварных і ад 130 да 180 крахмала-суп ыльных, крахмала-цірачных, крахмала-патачных і бульба-сушыльных заводаў. За пяцігодку на гэту справу пойдзе 10,5 мільёнаў руб.

Ад павялічэньня колькасьці заводаў па пераапрацоўцы бульбы ўзьнімецца таварнасьць бульбы, а раз так, то і таварнасьць усёй сельскай гаспадаркі. Асабліва важнае значэньне набывае выраб сьпіртусу, які можна скарыстоўваць на розныя тэхнічныя мэты, і выраб якога каштуе таньней, чым выраб бэнзіну.

Досыць значную ролю можа граць бульба і ў сэнсе калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Селяніну куды карысьней арганізаваць таварыства па дастаўцы на броварны бульбы, чым рабіць гэта індывідуальным парадкам. У гэтым-жа зацікаўлены і самі прадпрыёмствы, бо з таварыствам і калектывамі лепш весьці плянавую працу, чым з тысячамі паасобных гаспадароў.

Задачы і праца бульбяной станцыі.

Аднак, ня гледзячы на добрыя ўласьцівасьці бульбы і на яе выключную ролю, якую яна адыгрывае ў сельскай гаспадарцы, ураджаі яе ў час вельмі нізкія. Па акругах ураджаі разьмеркаваны такім чынам:

Полацкая акруга—339 пуд. з дзесяціны, Віцебская—325 пуд., Аршанская—549 пуд., Менская—550 пуд., Магілёўская—508 пуд., Бабруйская—580 пуд., Мазырская—550 пуд., Гомельская—580 пудоў.

325 пудоў у Віцебшчыне і 2000-2500 п. у Нямеччыне, Галяндыі. Ды на што браць заграніцу, калі і ў нас такія прыклады ёсьць: вопытна-паказальнае поле Ціміразеўскай Сел.-Гас. Акадэміі мае такія-ж самыя ўраджаі. Вядома, „даганяць і абганяць" Галяндыю мы сёньня ня зьбіраемся, але ўзьняць ураджай бульбы хоць-бы да ўзроўню нашых савгасаў—зусім рэальная рэч. Тысяча пудоў бульбы з дзесяціны—ня дзіва і не фантазія, а справа бліжэйшых гадоў.

Адшуканьне і выпрацоўка спосабаў узьняцьця як ураджаяў, так і ўсёй культуры бульбы ў цэлым у Беларусі да найвялікшых разьмераў магчыма пры прыродных і эканамічных умовах Беларусі—асноўная мэта ўтварэньня Беларускай цэнтральнай бульбяной станцыі.

Для дасягненьня гэтай агульнай мэты станцыя ставіць перад сабою чатыры задачы:

1. Адшуканьне сярод існуючых ужо гатункаў альбо ўтварэньне нават новых гатункаў бульбы, якім уласьцівы харчовыя, тэхнічныя і кармавыя перавагі, найбольш ураджайныя і найбольш адпаведныя глебавым, кліматычным і эканамічным умовам Беларусі.

2. Забясьпечаньне добраякасным, апрабаваным матар'ялам насенных бульбавых гаспадарак.

3. Выпрацоўка рацыянальных мер аховы і барацьбы са шкоднікамі і хваробамі бульбы.

4. Устанаўленьне асноў рацыянальных прыёмаў культуры бульбы ў умовах сельскай гаспадаркі Беларусі.

Але ўсё-ж такі грунтоўнай задачай для станцыя зьяўляецца першая задача—задача **адшуканьня і стварэньня неабходных нам гатункаў бульбы.** Вакол гэтай задачы пабудавана ўся астатняя праца. Станцыя вывучае гатункі бульбы, якія ёсьць у Беларусі; сыстэматызуе гэтыя гатункі; складае вызначэньні гатункаў; вывучае разьмеркаваньне асобных гатункаў па акругах і раёнах БССР.

Каб зрабіць усебаковае гатункаапрабаваньне, станцыі неабходна патраціць шэсьць год. Толькі пасьля такога тэрміну можна вывучыць гатунак, зрабіць яго лепшым для нашых умоў і накіраваць яго на месца. Вядома, такі тэрмін занадта вялікі. Краіне патрэбны добраякасныя гатункі зараз. Дзе іх узяць? Як паскорыць вывучэньне? Станцыя прымушана была пайсьці на часовы мэтад сэлекцыйнае працы—мэтад масавага адбору, масавага палепшаньня гатункаў, ачыстка плянтацыі ад прымешак, і наогул ад усякіх нядобраякасных кустоў. Такім чынам, станцыя зможа ў гэтым годзе перадаць Дзяржаўнаму Насеннаму Фонду каля 25 тысяч пудоў ачышчанай бульбы гатунку „Вольтман". Гэтая бульба будзе разьмяркована паміж савгасамі для далейшага прасоўваньні ў вёску.

Сёлета-ж станцыя зробіць апрабацыю гатункаў у 127 савгасах, 52 таварыствах і калгасах і ў 8 дасьледчых станцыях. Тыя гатункі, якія будуць прызнаны добраякаснымі, працоўнікі дасьледчай станцыі будуць раіць пашыраць сярод вакольнага сялянства. Асабліва высокай якасьці гатункі будзе забіраць Дзяржаўны Насенны Фонд.

У наступным годзе станцыя будзе мець 60 гэктараў сэлекцыйнай бульбы. Прыблізна каля 30 тысяч пудоў добраякаснага гатунку зноў будзе перададзена Дзярж. Насен. Фонду.

Лепшыя гатункі бульбы будуць пасылацца і сялянам-дасьледчыкам для канчатковага гатункаапрабаваньня і прыстасаваньня да сялянскіх умоў. У гэтым годзе такая праца ўжо праводзіцца на 23 пунктах. Налета колькасьць пунктаў пашырыцца да 50. З цягам часу станцыя арганізуе шырокую сетку гатункаапрабавальных пунктаў па ўсёй БССР у разных кліматычных і гаспадарчых раёнах рэспублікі.

Сеянцы бульбы.

* Весткі ўзяты з арт. Г. Гарэцкага: „Эканамічнае значэньне культуры бульбы ва Беларусі".

Станцыя жадае мець як мага хутчэй практычныя вынікі сваёй працы, а таму, не чакаючы тых гатункаў, якія прайдуць дэтанёвае шасьцігадовае апрабаваньне, робіць масавы адбор бульбы і разьмяркоўвае яе.

Мэтад масавага адбору вельмі карысны і эфэктны, а таму станцыя раіць карыстацца ім савгасам, калгасам, каапэрацыйным, сельска-гаспадарчым аб'яднаньням і сялянам наогул, вядома, пад кіраўніцтвам спэцыялістаў гэтае справы.

У мінулым годзе станцыя рабіла вопыты па гатункаапрабаваньню бульбы. Лепшымі аказаліся наступныя:

НАЗВА ГАТУНКАЎ	Ураджай у цэнтнэрах.	Крахмалістасьць у проц.
Рэйтан (каршавы) .	240,5	13
Кругэр (каршавы) .	221	12
Вольтман (заводзкі)	191	17,9
Сілезія (заводзкі) .	187,9	16,3
Смыслаўскі (стал.).	203	15,6

А звычайная ўраджайнасьць мясцовых беларускіх гатункаў 83—85 цэнтнэраў пры 12-15 проц. крахмалу. Бачыце, якая вялікая розьніца.

Адсюль сам сабой напрашваецца вывад: трэба заводзіць новыя гатункі. Трэба зводзіць, зьнішчаць непрыбытковыя „Махраткі", „Жоўтаружныя", „Велікаркі" і інш. Трэба мець якіясьці новыя гатункі, бо выключна ад перамены гатунку ўзьнімецца ўраджайнасьць бульбы на 15 проц. Гэта самае малое. Бывае, што павялічэньне дасягае нават да 50 проц. Бачыце, якая вялікая розьніца і якія багатыя магчымасьці ў нас ёсьць. Ня кажучы ўжо аб тэхніцы апрацоўкі зямлі і ўгнаеньнях, выключна толькі ад зьмены гатунку. Мы выйграем мінімум 15 процантаў. Над гэтым трэба задумацца, над гэтым варта папрацаваць.

Але чым заняпіць? Якія ўвесьці новыя гатункі? Хоць станцыя і ня мае ў гэтым вялікага вопыту (арганізавалася яна ў 1928 годзе), але ўсё такі можа даць некаторы папярэдні але абгрунтаваны погляд на гэтую справу.

На нашых палёх можна сустрэць, што хочаце, але недобраякасны гатунак бульбы. Вы знойдзе „Вольтман", „Несьцер", „Грацыю", „Балотны", „Гэрой", „Маршчаваты", „Пірагі", „Пяст", „Саксонію", „Бравар ку", „Тухчанку", „Раньняю ружу", „Позьнюю ружу", „Буксу", „Бовэ", „Сілезію", „Мэркэр", „Рублёўку", „Рыхтаро ўку", „Кругар", „Гаўропак", „Махратку", „Бабчанку", „Эпікур", „Сіняцьветку", „Мышку", „Тысячку", „Піражок". Вы знойдзеце больш шасьцідзесяці гатункаў, і амаль што ўсе яны ня будуць чыстымі гатункамі, а ў прымесі з другімі.

Якія лепшыя з іх? Якія больш падыходзяць да Беларусі?

Адказаць вельмі цяжка. Кожная акруга і нават раён маюць свае спэцыфічныя ўмовы. Напрыклад, гатунак „N" для Калінкавіч вельмі падыходзе, а для Дрыбіна нікуды няварты. Але-ж усё-такі, ня гледзячы на гэта, ёсьць некалькі гатункаў, якія можна раіць амаль што ва ўсе месцы БССР. З заводзкіх гатункаў лепшыя: „Вольтман", „Сілезія", „Гаўронак"; з кармавых: „Гранат" (для балотных месц), „Кругэр", „Рытан", са сталовых: „Смыслаўскі", Народны" (б. „Імпэратар"); з раньніх: „Эпікур», «Раньняя ружа". Воск тыя гатункі, якія для Беларусі зьяўляюцца больш адпаведнымі. На іх і зварачвае асаблівую ўвагу станцыя, вывучае асаблівасьці кожнага гатунку і хваробы, якія нападаюць на іх.

— „Працы па гісталёгіі бульбы"—расказвае ў пасьпенгазэце станцыі Дановіч, маюць ня толькі вялізарны—навуковы інтэрэс, але больш чым вялікае значэньне ў бульбяной прамысловасьці, а таму ня могуць не зьяўляцца арганічнай часткай прац вопытнай бульбянай станцыі. Ёсьць некаторыя моманты, якія могуць быць вырашаны толькі пры дапамозе гістарычнага аналізу. Так, вядома, наколькі важнае значэньне для крахмальнай прамысловасьці мае агульная процантная колькасьць крахмалу ў гатунку бульбы.

Аднак, адзін гэты факт недастатковы. Могуць быць два гатункі адпаўнавыя па агульнай процантнай колькасьці крахмалу і ў той-жа час яны неаднолькова каштоўны для крахмальнай прамысловасьці.

Дзе прычына, што крахмал гэтых гатункаў розны? Адказ можа даць толькі падрабязнае вывучэньне пад мікраскопам асобных тканяў, з якіх пабудаваны клубні гэтых гатункаў.

Праца па анатоміі бульбы—новая ня толькі ў нас, але і РСФСР. Яна распачата ў 1925 г. ў Горы-Гарацкай Акадэміі і зараз працягваецца тут на станцыі. Ад колькасьці і буйнасьці крахмальных зярнят залежыць і якасьць гатунку, а таму гэта праца досыць вяжная, патрабуючая настойлівасьці і вялікай пільнасьці.

Вядуцца на станцыі працы і па вывучэньню хвароб бульбы. Адабраныя гатункі бульбы сэлекцыянэрамі адаюцца для аналізу фітапатолёгам (фітопатолёгія—навука аб хваробах бульбы) тым-жа месцы, бо гэта спрыяе размножаньню хвароб. Пажадана, каб бульба зварачалася на тое месца, у якім яна была, напрыклад, сёлета, праз чатыры-пяць, а то нават і шэсьць год. Вядома, у трохпалёвым севазвароце гэтага цяжка прытрымліваецца, але-ж усё-такі больш працяглае чаргаваньне для бульбы, як і для ўсіх расьлін, пажадана.

Падрыхтоўка поля пад бульбу павінна распачацца прыблізна ў жніўні. Пасьля жніва, як мага раней, поле трэба ўзараць (можна ўзараць звычайна плугам). Рана вясной неабходна глыбока заараць. Праф. Даярэнка так кажа адносна гэтага: «Галоўная ўмова посьпеху сяўбы яравых—гэта сяўба іх увясну, у нагрэтую, праветраную пасьля зімовага ляжаньня, але нявысахшую зямлю».

Што датычыцца ўгнаеньня, то яго лепш уносіць пад бульбу (па назіраньнях нам. дырэктара станцыі Максімовіча) штогод невялікімі порцыямі. Але ўсё такі больш гаспадарча-практычную карысьць дае такая камбінацыя: паловы нормы гною (1200 пудоў), 18 пудоў супэрфасфату і 50 пудоў попелу. Калі ўнесьці такое ўгнаеньне, то ўраджай бульбы супроць зусім няўгноенага вучастку надвысіцца ў два разы.

Час сяўбы бульбы выбіраецца ў залежнасьці ад ходу вясны: цёплая вясна—раньняя сяўба, халодная надвор'е—пазьнейшая сяўба. Калі асабліва добрая вясна, трэба як мага раней садзіць бульбу, бо ад гэтага залежыць яе далейшае разьвіцьцё, яе ўраджайнасьць. Што датычыцца густаты сяўбы, бульбы піша прафэсар-акадэмік Правішнікаў,—„то тут мае месца агульнае правіла: Калі багатая глеба і спрыяючы клімат, то рэдка трэба разьмяркоўваць бульбіны, хістаньні да таго значны, што плошча, якая прыходзіцца на адну расьліну, зьмяняецца ад 1000 да 3000 кв. сант. (а ў некаторых спэцыяльных выпадкаў яшчэ ў больш вялікіх разьмерах). Густата сяўбы зьмяняецца далей у залежнасьці ад гатунку—позьнія гатункі, якія маюць моцнае бацьвіньне, разьмяркоўваюцца радзей, раньнія—гусьцей; ад буйнасьці бульбін—буйныя бульбіны, якія даюць больш моцныя расьліны, разьмяркоўваюцца радзей, дробныя—гусьцей; ад спосабу культуры—пры праворваньні, напрыклад, у адным кірунку, расьліны могуць зьмяшчацца цясьней, але-ж праворваньне робіцца ў двух кірунках, патрабуецца больш рэдкае разьмеркаваньне і г. д. Ва ўсякім выпадку, гушчыня сяўбы павінна быць такая, каб расьліны маглі аб'яднацца, але не перашкаджалі-б адна другой. Для сярэдніх глеб можна прыняць адлегласьць паміж расьлінамі ў 12-14 вяршкоў між радамі і 6-8 у родах; для дужа багатых глеб і буйных бульбін гэта адлегласьць можа даходзіць да 16×12 вяршкоў. У нас пырыня паміж радзьдзяў часьцей за ўсё—9:12 в., пры 8—6 вяршкох паміж бульбінамі ў раду; па даных-жа некаторых нямецкіх аўтараў (Remy) адлегласьць 12×8 вяршкоў зьяўляецца мінімальнай». Па некаторых даных іншых дасьледчых станцый самай рэнтабельнай зьяўляецца сяўба 8×8 вяршкоў. (На лёгкіх, супясчаных, пясчаных, сугліністы і сярэдніх глебах). Устанавіць пэўны шаблён у гэтым пытаньні нельга; усё залежыць ад якасьці глебы, гатункаў бульбы, кліматычных умоў і інш. Але-ж усётакі тая пасадка бульбы, якой карыстаемся мы, нявыгадная і яе трэба зьмяніць. Бульбу трэба садзіць раджэй. Вельмі карысна садзіць бульбу не на дно баразны, а ў бок яе, у пульхны пласт зямлі.

Бульба наогул патрабуе добрага догляду; вельмі добра—асабліва на цяжкіх глебах—да красаваньня разы дватры абагнаць бульбу. Улетку ні ў якім разе нельга пасьвіць на бульбе жывёлу, а таксама і зжынаць зялёнае бацьвіньне ў часе красаваньня, бо гэтым затрымліваецца рост і тым самым жа, перад тым, як выбіраць бульбу, дзён за дзесяць, бацьвіньне бульбы можна зжынаць і заквашваць у сілосьнай прыгатаванай яме. Гэта забясьпечыць гаспадарку на зіму вельмі каштоўным кормам.

За лета мы можам заўважыць, здаровая наша бульба ці не. Калі ўсё бацьвіньне залёнае, калі летам незаўважана было ніякіх хвароб, што можна бачыць хоць-бы з несвачасовага адміраньня лісьцяў,—тады найленей выбіраць бульбу, калі пачнецца натуральнае адміраньне бацьвіньня. У нашых умовах пачынаць выбіраць бульбу можна ў канцы верасьня і выбіраць праз увесь кастрычнік.

Выбраўшы бульбу, трэба яе добра прасушыць, адабраць хворую, а таксама, у залежнасьці ад патрэбы, адабраць насенку ад кармавой.

Ні ў якім разе нельга ссыпаць у капцы ці ў склеп бульбу вільготнаю або з прымешкаю хворых бульбін, бо апошнія згніюць самі, а праз іх загніецца і здаровая бульба.

Склеп, прызначаны для хаваньня бульбы, улетку трэба добра прасушыць і пабяліць вапнаю. На зіму ў склепе павінна быць добрая вэнтыляцыя, каб даць доступ паветру, якое вельмі патрэбна для бульбы. Ні ў якім разе няможна дапускаць, каб у склепе была парнасьць і вільгаць; тэмпэратура павінна быць ад 2° да 3° цяплыні па Ц.

Калі бульбу ссыпаюць у капцы, дык у даным разе асабліва трэба клапаціцца аб тым, каб бульба была добра прасушана, вельмі ўважліва адабрана ад хворых і падазроных на хваробу бульбін. Ссыпаючы ў капцы, трэба таксама клапаціцца аб доступе паветра на працягу зімы, для чаго з дошчак або жэрдак робяць спэцыяльныя прадушыны, якія праводзяць паветра ў капец.

Нарэшце, трэба падкрэсьліць, што мы значна можам павялічыць ураджай і прыбытковасьць нашае гаспадаркі, калі на практыцы будзе ўжываць усе сучасныя дасягненьні навукі і тэхнікі".



Анатамічнае і гісталёгічнае вывучэньне бульбы:

Скрыжаваньне бульбы.

Пасадка сортаспрабаванай бульбы.

Палепшаньне бульбы і дагляд за ёю.

Як ужо мы вышэй адзначалі, на нашых палёх знаходзіцца вельмі вялікая колькасьць гатункаў. Адны з іх вельмі добрыя, адпавядаючыя ўсім запатрабаваньням, другія нікуды ня вартыя, якія даўно ўжо час выкінуць з поля. Усе гэтыя гатункі ў большай або меншай меры нездаровыя, хворыя. У сялянскай гаспадарцы досыць цяжка знайсьці хоць-бы які-небудзь адзін гатунак бульбы, які быў-бы абсалютна здаровы. Вядома, такое становішча цярпець немагчыма. Хваробы бульбы з кожным годам павялічваюцца—гэтаму яшчэ спрыяе размаітасьць гатункаў; усё гэта адбіваецца на якасьці бульбы і, бязумоўна, на яе ўраджаях. Сялянская гаспадарка ад гэтага церпіць вялічэзныя страты.

Дзе-ж выхад? Што рабіць? Якія прыняць тэрміновыя меры, якія забясьпечылі-б бульбу ад далейшага пагоршаньня якасьці і зьніжэньня ўраджаяў? „Выхадаў" і „тэрміновых мер" вельмі многа. Але трэба выбраць нешта простае, зразумелае шырокім колам сялянства і, разам з тым, радыкальнае, эфэктнае.

Намесьнік дырэктара дасьледчай станцыі тав. М. Максімовіч мае на гэтую справу такі пункт погляду, які і практыкуецца, як часовая мера на станцыі: масавая ачыстка бульбы ад іншых гатункаў і хворых кустоў. Ёсьць два спосабы, на якіх мы і застановімся.

Першы спосаб. Засеяна ваша поля, напрыклад, „Вольтманам". Каб ачысьціць „Вольтман" ад „прымешак", вы павінны ў часе красаваньня вырваць усе кусты другога гатунку, а таксама і кусты „Вольтмана", але, на наш погляд, больш слабейшыя за іншыя. Такім чынам, вы зможаце быць упэўнены, што насеньне, атрыманае з ачышчанага вучастку, будзе менавіта насеньнем пажаданага для вас „Вольтмана" і к таму-ж адноякасным, лепшым, чым было-б яно, калі-б вы не рабілі ачысткі. На другі год можаце паўтарыць тое-ж самае, на трэці—таксама і г. д. Урэшце, вы будзеце мець куды лепшы „Вольтман". Здаравейшы і вышэйшы па якасьці, чым мелі некалькі год таму назад.

Другі спосаб. Гэты спосаб менш практычны, але усё-ж такі заслугоўвае належнае ўвагі, асабліва ў умовах дробнай гаспадаркі, якою менавіта і зьяўляецца гаспадарка беларуса-селяніна. Перад самым пачаткам збору ўраджаю вы можаце выбраць больш мацнейшыя кусты якога-небудзь гатунку і выкапаць іх на насеньне. На другі, трэці, чацьверты гады паўтараеце гэта-ж самае і, такім чынам, палепшаеце якасьць гатунку.

Гэтыя два спосабы масавага палепшаньня гатункаў бульбы асабліва не вымагаюць ад гаспадарак дакладных агранамічных ведаў (другая справа, што навуковыя веды ўсюды патрэбны) і даступны кожнаму селяніну. Аб іх трэба расказаць кожнаму селяніну, а ў першую чаргу—актыву вёскі, аб'яднаному ў сельска-гаспадарчыя гурткі. Гэтыя спосабы трэба сёлета-ж скарыстаць на практыцы, а ўвясну закласьці спэцыяльныя паказальныя дзялянкі, каб у карысьці гэтых мэтадаў мог упэўніцца кожны селянін. Вядома, за год, за два саматужнага палепшаньня ня зробіш добраякаснымі, чыстагатунковым „Вольтман" або „Сілезію"—гэта праца дасьледчых станцый, але палепшыць гатункі ў значнай меры, ачысьціць іх ад прымешак можна. Ад гэтага гаспадарка выйграе шмат чаго.

Беларусь багата пяскамі. На жвіру не пасееш ні пшаніцы, ні канюшыны, ні сэрадэлы, ні карняплодаў. Жыта крыху ўродзіць, грэчка будзе ўдалая. Але сеяць адно жыта або ў перамежку з грэчкай—рэч нявыгадная для гаспадаркі: пахаць, урэшце, дойдзе да такога становішча, што катэгарычна адмовіцца радзіць зернавыя культуры, вось тут і прыходзе на дапамогу бульба. Яна не патрабуе высокай прыроднай якасьці глебы, яна досыць добра родзіць і на супячанай і нават пясчанай глебе. Трэба толькі ўгнаеньне і супясчаная пахаць для некаторых гатункаў самая лепшая. І зноў такі; бульба можа даваць добрыя ўраджаі і на сугліністы глебах, чым таксама багата Беларусь.

Універсалізм бульбы ня зусім любіць частае паўтарэньне на адным і тым-жа месцы, бо гэта спрыяе размножаньню хвароб. Пажадана, каб бульба зварачалася на тое месца, у якім яна была, напрыклад, сёлета, праз чатыры-пяць, а то нават і шэсьць год. Вядома, у трохпалёвым севазвароце гэтага цяжка прытрымліваецца, але-ж усётакі больш працяглае чаргаваньне для бульбы, як і для ўсіх расьлін, пажадана.

Трэба палепшыць эканамічнае становішча станцыі.

На дасьледчыя працы РСФСР выдаткавана 2 мілёны руб. На такую-ж тэрыторыю Амэрыка выдае 450 мілёнаў руб. Бачыце, які страшэнна вялікі кантраст. Царская ўлада садзейнічала разьвіцьцю броварных заводаў, залівала „матушку-Расею" гарэлкай, пісала—„патронов не жалеть" і зусім ня цікавілася разьвіцьцём сельскай гаспадаркі. Дасьледчыя працы, у прыватнасьці на бульбяной справе, пачалі праводзіцца зусім нядаўна. Толькі ўлада рабочых і сялян зацікавілася гэтым пытаньнем і арганізавала шэраг новых дасьледчых станцый. Беларусь, як самы багаты бульбяны райён СССР, таксама ўтварыла сваю ўласную цэнтральную бульбяную станцыю. Восеньню 1928 г. савгас В. Сьляпянка быў перададзены пад станцыю.

Покуль што станцыя ня мае добрых спрыяючых умоў для навуковай працы. Цяжкае матар'яльнае становішча дае адчуваць сябе на кожным кроку. Трэба прыняць неабходныя меры, каб паладзіць працу дасьледчай станцыі, бо невялікая затрата сродкаў у кароткі час апраўдае сябе і дасьць вялікую карысьць рэспубліцы.

На 1928-29 г. станцыя атрымала 30 тысяч руб. З гэтай сумы 8 з паловай тысяч руб.—на будаўніцтва. Гэтых 8 з паловай тысяч руб. вельмі мала. У галоўным памяшканьні нельга разгортваць навуковай працы. Зімой холадна сядзець ня то што працаваць. Ёсьць пакоі, якія зусім ня маюць вокнаў—сьвятло праходзе ў шкляныя дзьверы; зімой дзьверы заканапацяцца, і прыдзецца з лямпай днём сядзець у пакойчыку, каб хаця крыху так-сяк працаваць. Пра кватэры для навуковых працаўнікоў можна сказаць тое-ж самае. Вядома, гэта недарэчнасьць. Даўно ўжо час узяцца за пераабсталяваньне гэтага дому пад лябараторыю і жыльлё.

Яшчэ большая недарэчнасьць тое, што на станцыі не хапае склепаў для хаваньня бульбы. Склеп, які ёсьць не адпавядае патрэбным умовам. Станцыя агітуе за правільнае хаваньне бульбы, але-ж і сама амаль што ня мае такой магчымасьці. У наступным годзе станцыя ня зможа захаваць усю бульбу ў склепе (сёлета 7 гэктараў пад навуковымі пасевамі, а налета будзе 15). Шырокая задача, праблема, калі хочаце, менавіта праблема ўзьняцьця ўраджайнасьці бульбы і стварэньне новых беларускіх гатункаў бульбы ўпіраецца, як гэта ні дзіўна і сьмешна, у якісьці склеп... Праблема і склеп!.. Такое недарэчнае разыходжаньне трэба выправіць як мага хутчэй. Зацікаўленыя арганізацыі павінны дапамагчы.

Да рэчы аб зацікаўленых арганізацыях і іх дапамозе. Харчтрэст, Белсельтрэст і Белдзяржтрэст робяць поўныя адлічэньні ад сваіх прыбыткаў карысьць агранамічных мерапрыёмстваў. Гэтыя сродкі павінна атрымліваць цэнтральная бульбяная станцыя. Але адно—павінна, а другое—ці атрымлівае яна іх? Станцыя ня бачыць ніякіх сродкаў. Гэтыя сродкі ідуць на ўсялякія мэты, толькі не ў карысьць агранамічных мерапрыёмстваў, не ў карысьць цэнтральнай бульбяной станцыі.

А ў РСФСР усюды пастаўлена гэта праца досыць добра, і дасьледчыя станцыі атрымліваюць поўнасьцю прызначаныя сродкі. Напрыклад, Каранеўская станцыя пад Масквой атрымала ў гэтым годзе каля 110 тысяч рублёў. Вядома, у нас будзе куды меншая сума (увесь бюджэт станцыі 30 тысяч руб.), але ўсётакі якая-б ні была сума—5-10 тысяч,—хай менш,—усётакі гэта быў-бы каштоўны ўклад у бюджэт станцыі, які даў-бы магчымасьць шырэй разгарнуць працу. Аб абавязковым адлічэньні поўных сродкаў у карысьць станцыі ёсьць абавязковая пастанова ўраду і вінаватых у невыканані яе, а вінаватыя менавіта так званыя „зацікаўленыя арганізацыі"—Харчатрэст, Белсельтрэст і Белдзяржсьпірт,—трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Станцыі адпушчана 300 руб. на дарожныя выдаткі. Сума малая. Укласьці ў трыста рублёў раўналежна таму, што трэба прыняць пастанову працаўнікам станцыі нікуды ня выходзіць са сьцен галоўнага памяшканьня, нікуды не выяжджаць для азнаямленьня як з навуковай пастаноўкай працы на другіх такіх-жа станцыях (РСФСР, Украіна), так і для вывучэньня тэхнікі апрацоўкі і гатункаў бульбы ў сялянскіх гаспадарках.

Дзяржаўны Насенны Фонд Наркамзему павінен вызначыць сродкі для масавага абсьледваньня сялянскіх гаспадарак якой-небудзь, больш характэрнай для Беларусі, акругі. Трэба-ж ведаць станцыі аўдыторыю, для якой яна працуе, трэба-ж мець грунтоўныя, праверваныя падставы для працы. Такога напрамку працы вымагае жыцьцё. І зноў-такі зацікаўленыя арганізацыі павінны адкінуць бюрократычна-казённыя адносіны да гэтай справы і дапамагчы станцыі неабходнымі сродкамі.

Ды сам Наркамфін БССР не падтрымлівае станцыю. У мінулым годзе штат стэнцыі складаўся з 10 чалавек; на апэрацыйныя выдаткі было адпушчана 4500 руб. Сёлета-ж штат павялічваецца на чатырох навуковых працаўнікоў, а апэрацыйныя выдаткі зьмяншаюцца на 500 руб. Раз павялічваюцца навуковыя працаўнікі, то, бязумоўна лёгічны вывад—трэба павялічыць сродкі, але Наркамфін БССР, як відаць, прытрымліваецца зусім супроцьлеглых поглядаў на гэтую справу і разам з павялічэньнем штату зьмяншае апэрацыйныя выдаткі.

На ліквідацыю гэтых недахопаў патрабуецца невялікая затрата сродкаў, і трэба спадзявацца, што станцыя іх атрымае. Тады яшчэ шырэй разгорнецца навуковая дасьледчая праца станцыі і яна зможа ў бліжэйшыя гады задаволіць Беларусь гатунковым насеньнем бульбы. Культурная выспа на Сьляпянцы ў трыста дзесяцін зможа зрабіць (вядома, пры належным падтрыманьні) рэвалюцыю ў сельскай гаспадарцы.

Трэба заўсёды памятаць, што падвоіць ураджай бульбы—не фантазія агранамаў і ня выдумка спэцыялістаў, а зусім рэальная для Беларусі рэч. На тысячы пудоў бульбы з дзесяціны мы ўжо зьбіраем у некаторых савгасах і сялянскіх гаспадарках і не таму, што там лепшая земля. Дык чаму-ж не дасягнуць гэтага па ўсёй БССР? Чаму-ж не дайсьці да гэтага якім-небудзь Забашэвічам з-за Барысава і Глухой Суслаўцы з-за Воршы? Яны дойдуць. Яны ўжо ідуць. Цэнтральная Бульбяная Станцыя дапаможа ім у гэтым, дасьць сродкі для шпарчэйшага перасоўваньня ад 500 да 1000 пудоў з дзесяціны. Новыя гатункі, лепшая тэхніка, угнаеньне—і мы заваюем тысячу!

В. Сьляпянка, Менскай акр.

Цім. Зярэчны.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладу Наркамзему і Белкамзэту аб практычным ажыцьцяўленьні пастаноў Ураду БССР аб землеўпарадкаваньні працоўных яўрэяў.

1. Праведзеная работа па землянадзяленьні яўрэйскага бедняцкага насельніцтва ўпаўне апраўдала тыя мэты, якія былі пастаўлены дэкрэтам Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 25-га ліпеня 1924 г. аб земланадзяленьні яўрэйскіх працоўных мас. Да гэтага часу каля 11.700 бедняцкіх яўрэйскіх сямей земляўпарадкаваны ў БССР, а таксама часткова пераселены ў іншыя райёны Савецкага Саюзу на земляробчую працу.

Яўрэйскія бедняцкія масы, якія перайшлі на земляробчую працу прыстасаваліся да яе, у асноўным будуюць сваю гаспадарку на калектыўных началах (60 проц. сямей з землянадзеленых за апошняе пяцігодзьдзе калектывізаваны), у значнай частцы ўзмацнілі свае гаспадаркі, ужываюць культурныя мэтады працы, чым прыцягваюць увагу і прыхільнасьць да сябе акаляючага земляробчага насельніцтва.

З выдзяленьнем дадатковых фондаў на працягу бліжэйшага пяцігодзьдзя 30.000 гэкт. падлесных зямель і мінімум 50 тыс. гэкт., балотных зямель на буйных сплашных масывах, праца па земляўпарадкаваньні працоўных яўрэяў ў БССР уваходзіць у новы этап, які сустракае вялікія цяжкасьці па сваім ажыцьцяўленьні, але разам з гэтым павялічвае пэрспэктывы разьвіцьця земляўпарадкаваньня працоўнага яўрэйскага насельніцтва і дае магчымасьць сканцэнтраваць работу, арганізаваць буйныя калгасы і паленшыць палітычнае і культурнае абслугоўваньне яўрэйскіх земляробаў.

2. Гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак якое праводзіцца ў БССР, дае магчымасьць пераходу значнай часткі яўрэйскага местачковага бедняцкага насельніцтва на вытворчую працу праз земляўпарадкаваньне, разьвіцьцё саматужных промыслаў і ўцягненьне яго ў якасьці рабочых у прамысловасьць.

3. Побач з прыцягненьнем бедняцкага яўрэйскага насельніцтва ў вытворчую працу ў межах БССР, праводзілася вялікая работа па перасяленьні яго на буйныя калфонды за межы БССР, у асаблівасьці ў Крым і Біра-Біджан.

4. Разам з гэтымі дасягненьнямі, Прэзыдыум ЦВК канстатуе шэраг недахопаў: марудное асваеньне выдзяленых фондаў; не заўсёды дастаткова якасны спэцыяльны падбор кантынгенту перасяленцаў і расселенцаў і наліччa выпадкаў, калі ў існуючых калгасах знаходзяцца капіталістычныя элемэнты, якія вядуць дэзарганізатарскую працу; недастаткова канкрэтна распрацаваны плян асваеньня балотных масываў для яўрэйскага земляўпарадкаваньня; недастаткова плянавая праца па перасяленьні на калфонды ў іншыя райёны СССР; недастаткова разгорнута праца па кваліфікацыі і перакваліфікацыі яўрэйскага бедняцкага насельніцтва; недастатковая культурна-асьветная праца сярод уцягнутага і ўцягваемага ў вытворчую працу бедняцкага насельніцтва; выпадкі недастатковага дапасаваньня да працы паасобных членаў яўрэйскіх калгасаў, у асаблівасьці жанчын.

5. У мэтах далейшага разьвіцьця работы па ўцягненьні бедняцкага яўрэйскага насельніцтва ў вытворчую працу, Прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

а) Узмацніць работу па сваечасовому выдзяленьню і асваеньню зямельных фондаў з такім разьлікам, каб асваеньне і выдзяленьне вызначаных па пяцігодзьдзі фондаў было ў плянавым парадку выкананa.

б) Побач з выдзяленьнем маючыхся вакол мястэчак свабодных зямельных вучасткаў для бедняцкага яўрэйскага насельніцтва гаспадарча-ўпарадкаваемых мястэчак, праводзіць перасяленьне часткі гэтага насельніцтва, якая ня можа быць у мястэчку ўцягнута ў вытворчую працу, на выдзеленыя калфонды.

в) Паскорыць працу па вытворчым капэраваньні раней арганізаваных яўрэйскіх вёсак і калёній.

г) Маючы на ўвазе, што ў некаторыя яўрэйскія калгасы прасякнуў заможны і спэкулюючы элемэнт, які дэзарганізуе працу ў гэтых калгасах, даручыць Белкамзэту сумесна з Наркамземам і Белкабгассаюзам прыняць шэраг рашучых мер да ачысткі калгасаў ад гэтых элемэнтаў.

6. Побач з далейшым разьвіцьцём работы па земляўпарадкаваньні працоўных яўрэяў у БССР, прымаючы пад увагу абмежаванасьць дастатковых зямельных фондаў, даручыць Наркамзему і Белкамзэту ўзмацніць працу па перасяленьні бедняцкага яўрэйскага насельніцтва для земляўпарадкаваньня на выдзяляемыя буйныя масывы ў іншых раёнах Саюзу ССР (Біра-Біджан, Крым).

У сувязі з гэтым, паставіць пытаньне перад Прэзыдыумам ЦВК СССР аб павялічэньні фінансаваньня працы па земляўпарадкаваньні бядняцкіх яўрэйскіх мас як у БССР, так і на буйных калфондах у Біра-Біджане, Крыме і іншых раёнах СССР.

7. Даручыць Наркамасьветы, Наркамзему, Белкамзэту, Белдзяржвыдавецтву, Белкалгассаюзу і Акрвыканкомам узмацніць культурна-асьветнае абслугоўваньне яўрэйскага земляробчага і саматужнага насельніцтва, прымаючы меры да папулярызацыі дасягненьняў у гэтай працы, завастраючы ўвагу на задачах зьвязаных з рэканструкцыяй вёскі,—па правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўзмацняючы інтэрнацыянальнае выхаваньне пры ажыцьцяўленьні гэтых задач.

Час. вык. абав. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

20 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Праца жанчын—неадымная частка ўсёй партработы.

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб узмацненьні працы жанчын атрымала свой практычны адбітак на нарадзе жанарганізатараў Фрунзэнскага раёну.

У сваім дакладзе тав. Альшэўская зазначыла на закаранелаcьць у гэтым пытаньні з боку паасобных партпрацаўнікоў. Жанпраца—неадымная частка ўсёй партпрацы. Але гэтага шмат якія партыйцы ня хочуць зразумець.

Ёсьць выпадкі, што камуністкі адмаўляюцца ад жанпрацы. Зараз, калі перад партыяй стаяць такія вялізныя задачы, як выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, работніца ня можа стаяць у баку.

Рабочая кляса расьце ў сваім культурна-палітычным разьвіцьці, аднак, работніца адстае. Прычыны гэтага розныя: у першую чаргу —бытавыя ўмовы жанчын. Нашы дзіцячыя ўстановы (ясьлі і дзіцячыя дамы) толькі прыстасаваны да дзённай працы работніцы на вытворчасьці. Увечары-ж гэтыя ўстановы зачынены. Гэта пазбаўляе шмат якіх работніц магчымасьці ўдзельнічаць у грамадзкай працы. Яны ня могуць кінець тым бурлівым культурна-палітычным жыцьцём, якім кіпіць рабочы-мужчына. Часам работніца, якая нядаўна была актыўнай грамадзкай працаўніцай, павінна адмовіцца ад сваёй нагрузкі. Гэта, вядома, перашкаджае росту партыі за лік работніц і не выпадкова ЦК УсеКП(б) высоўвае перад прафарганізацыямі пытаньні аб прыстасаваньні дзіцячых устаноў да грамадзкай нагрузкі жанчын-работніц. Гэтыя ўстановы павінны працаваць і ўвечары.

Жаночыя арганізатары, выступаючы па дакладу, адзначылі шмат ненармальнасьцяў.

У 1-й дзярждрукарні кваліфікацыя жанчын праводзіцца туга. Ёсьць вялікая закаранелаcьць у гэтым пытаньні. Гаспадарнікі ставяць вышэй лепш кваліфікаваць мужчыну, чымся жанчыну. Ёсьць выпадкі, калі ячэйка высоўвае работніц бяз ведама жаночых арганізацый.

Праца сярод жонак рабочых праводзіцца слаба. А гэты вучастак досыць адказны. Жонкі рабочых і служачых—гэта маткі-выхавацельніцы будучага пакаленьня. Ад іх узроўню і палітычнага разьвіцьця залежыць правільнае выхаваньне дзяцей. Многія жонкі рабочых удзельнічаюць у грамадзкай працы, у гарсавеце і іншых арганізацыях. Часам, палітычна неразьвітыя, яны ня могуць праводзіць строга клясавую лінію ў грамадзкай працы.

Яскравым прыкладам адсталасьці жонак рабочых можа служыць перавыбарчы сход у саюзе друкароў. Калі выставілі ў гарсавет кандыдатуру работніцы, многія жонкі рабочых далі адвод, тлумачачы тым, што «яна ня будзе абараняць нашы інтарэсы». З боку многіх жонак рабочых наглядаецца вайздрасьць да работніц, быццам яны карыстаюцца ўсімі „благами", а жонкі рабочых пазбаўлены гэтага.

На парадзе гаварылася аб неабходнасьці арганізацыі на прадпрыёмствах гурткоў для ўзьняцьця палітузроўню работніц і жонак рабочых, занятых на грамадзкай працы. Была прапанова склікаць нараду жаноргаў супольна з бюро ячэек для падрабязнай прапрацоўкі пастановы ЦК УсеКП(б).

Л. Н.

Віды на ўраджай—больш чым здавальняючыя.

У першай палове ліпеня колькасьць асадкаў была некалькі ніжэй звычайнай нормы, а таксама некалькі ніжэй была і тэмпэратура супроць сярэдняй за апошнія гады. Аднак, мэтэоролёгічныя ўмовы гэтага пэрыяду не адбіліся на стане пасеваў.

Паводле даных цэнтральнай экспартнай камісіі пры ЦСУ, стан азімых пасеваў на 15-га ліпеня па ўсёй БССР ацэньваецца балам 3,3 супроць 3,2 на 1-е ліпеня. Такім чынам, віды на ўраджай азімых больш чым здавальняючыя. Трэба адзначыць, што ў параўнаньні з мінулым годам на гэты-ж тэрмін сёлета ацэнка пасеваў азіміны вышэй на 0,6 бала.

Асабліва рэзкае падвышэньне дае Аршанская акруга: 3,5 супроць леташніх 2,5. Наогул менш 3,1 балу ні ў адным з акруг ацэнкі няма.

У галіне стану пасеваў ярыны мы таксама маем павышаную ацэнку супроць мінулага году: па ячменю і аўсу стан пасеваў ацэньваецца балам 3, — больш леташняга на 0,5. Найлепшая ярына ў сярэдняй і паўднёвай Беларусі.

Пасевы бульбы ацэнены балам 3,2 —супроць 2,3 у леташнім годзе.

Асабліва добрыя віды на ўраджай бульбы на Віцебшчыне (3,5—супроць 1,7 летась), і ў Полаччыне (3,1 супроць 1,7 летась) У Бабруйшчыне, Мазырышчыне і Гомельшчыне, якія зьяўляюцца райёнамі таварнай бульбы, становішча пасеваў апошніх ацэнена ў 3,2. Роўным чынам добрыя віды на ўраджай—лёну—сярэдні бал па БССР —2,9 супроць леташняга 2,5. У параўнаньні з мінулым годам, асабліва палепшылася становішча пасеваў лёну ў Віцебскай і Полацкай акругах.

У адносінах кармавой базы—віды на ўраджай траў таксама зусім спрыяючыя: канюшына амаль ужо сабрана і ацэнена балам 3,5—супроць леташніх 2,7. Сухадольныя сенажаці ацэнены балам 3—супроць 2,6 мінулага году. Хлебафуражны балянс на 1929-30 год будзе значна вышэй леташняга.

Сёлета назіраецца рост пасеўнай плошчы; асабліва павялічана пасеўная плошча ў бядняцкіх, а таксама серадняцкіх гаспадарках па азімых і яравых пасевах. Наогул, згодна папярэдніх даных кан'юнктурнай анкеты, агульная плошча ўсяго пасеву ў сялянскіх гаспадарках БССР павялічылася на 1,97 проц. Калі сюды ўключыць і павялічэньне плошчы пасеваў на аграмаджаному сэктару, дык агульнае павялічэньне дасягне 2,75 проц.

ХРОНІКА.

ГОЛАС ТЫСЯЧ ПРАЦОЎНЫХ.

У нядзелю 28 ліпеня ў садзе „Прафінтэрн" адбыўся партыйны сход Кастрычнікаўскага райёну супольна з беспартыйнымі рабочымі фабрык і заводаў гэтага райёну. На сходзе прысутнічала 15000 чалавек.

Сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Васілевіч, сустрэнуты гучнымі, доўга не змаўкаўшымі воплескамі шматтысячнай масы працоўных, зрабіў даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы.

У адзінадушна прынятай рэзалюцыі 15-цітысячны сход заявіў, што цалкам і поўнасьцю ўхваляе і актыўна падтрымлівае палітыку партыі ў міжнародных і ўнутраных пытаньнях.

Сход з вялікім абурэньнем адхіляе погляды правых укланістаў, якія тармозяць сацыялістычнае будаўніцтва.

Сьветачам генэральнай лініі нашай партыі зьяўляецца 5-цігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі, які мы ажыцьцявім пры нябачным гэраізьме мас у барацьбе за новую сапраўдна сацыялістычную вытворчасьць працы.

Сход патрабуе абуздаць кітайскіх сатрапаў. Мы, гавораць рабочыя, патрабуем ад Савецкага Ураду прыняць рашучыя крокі супроць зарваўшыхся кітайскіх і белагвардзейскіх банд. Мы заяўляем аб сваёй баявой гатоўнасьці стаць са зброяй у руках на абарону нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Праз галаву Чан-Кай-Шы мы шлем шчырае, палкае прывітаньне кітайскім рабочым і працоўным сялянам.

Мы шчыра вітаем верны ленінскім заветам—ЦК УсеКП(б).

Мы шлем шчырае, палкае прывітаньне цьвёрдаму праваднику ленінізму барацьбіту за чыстату ленінскай генэральнай лініі партыі—тав. Сталіну.

За калгасьнікамі забраніраваны месцы ў ВНУ.

Наркамасьветы забраніраваў за калгасьнікамі і іх дзецьмі 20 месц на факультэце калектыўнай гаспадаркі сельска-гаспадарчай акадэміі і 25 месц у тэхнікуме калектыўнай гаспадаркі. Апрача таго, за калгасьнікамі забраніравана 15 месц у Марына-Горскім сельска-гасп. тэхнікуме, 10 месц—у ст, Барысаўскім с-гасп. тэхнікуме і 70 месц на розных факультэтах сельска-гаспадарчай-акадэміі.

Новы буйны калгас.

У Грэскім райёне, Менскай акругі, арганізаван новы буйны калгас—„Чырвоны Маяк" на плошчы 1300 гэктараў. У калгас арганізавалася бядняцтва і серадняцтва суседніх вёсак.

Для сталай працы ў калгас увайшоў сябрам райёны аграном.

Пачаўся збор ураджаю.

У Случчыне сёлета добры ўраджай жыта і ярыны.

Сяляне ўжо пачалі жаць жыта і раньні ячмень. Надворе спрыяе збору ўраджаю.

Забясьпечаньне Белсельтрэсту с-г. машынамі і ўгнаеньнем.

Белсельтрэст гэтымі днямі выслаў у Маскву свайго прадстаўніка дзеля атрыманьня 20 паравых малатарняў для нашых савгасаў.

Да пасяўной кампаніі Белсельтрэст будзе мець 1000 тон супэрфасфату і 640 тон фасфарыту.

Апрача таго, Бельсельтрэст атрымаў 7 жнярак-снапавязак і 7 конных снапавязак. Жнярак конных атрымана 36 штук, а касарак—24 штукі.

Распачаўся 2-хтыднёвік фізкультуры.

У суботу 27 ліпеня па шэрагу фізкультурных гурткоў адбыліся ўрачыстыя вечары, прысьвечаныя 2-хтыднёвіку фізкультуры. Вечары праводзіліся супольна з рабочымі прадпрыёмствамі і служачымі ўстаноў. На вечарох заслухваліся даклады аб значэньні 2-хтыднёвіку фізкультуры, які павінен быць увязан з міжнародным Чырвоным днём.

У нядзелю 28 ліпеня на спортплацоўцы саду „Прафінтэрн" сабралася звыш 1000 фізкультурнікаў. Было праведзена шэраг спартыўных гульняў, пасьля чаго фізкультурнікі прынялі ўдзел у агульнай гарадзкой дэманстрацыі-карнавале.

Увечары ў нядзелю па гурткох фізкультурнікаў адбываліся ўрачыстыя сходы з адпаведнымі дакладамі і мастацкай часткай.

У часе 2-хтыднёвіка фізкультуры будуць праводзіцца ўнутрыгуртковыя спаборніцтвы на лепшага фізкультурніка гуртка. Асаблівая ўвага будзе зьвернута на ўцягненьне ў фізкультуру дарослых рабочых і рабочай моладзі.

Апавяшчэньне.

САД АСЬВЕТЫ.

Сёньня 30-7 роўна а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца зачышены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Яўка ўсіх сяброў ячэйкі—абавязкова.

6 жніўня—дзень індустрыялізацыі краіны.

У ЦСПСБ нашаму супрацоўніку паведамілі, што 6-га жніўня абвешчана днём індустрыялізацыі, і ўсе прадпрыёмствы і ўстановы ў гэты дзень будуць працаваць.

У тых установах, дзе ёсьць магчымасьць аплаціць за працу ў дзень 6 жніўня, дык заработак пойдзе ў фонд індустрыялізацыі краіны, а дзе гэтай магчымасьці няма, дык дапускаюцца адлічэньні з аднадзённага заработку пры ўмове поўнай добраахвотнасьці і паводле пастаноў агульных сходаў працаўнікоў.

Прэзыдыум ЦСПСБ даў указаньні аб тым, што дзень 6 жніўня зьяўляецца рабочым днём, або дзе ўведзен бесперарыўны рабочы тыдзень, дык па пастанове агульных сходаў для адпрацоўкі дню індустрыялізацыі вызначаецца які небудзь іншы дзень адпачынку ў жніўні месяцы.

Для груп членаў саюзу, якія ня могуць адпрацаваць гэтага дню (студэнцтва, хатнія работніцы і інш.), будуць наладжвацца суботнікі. Заработак ад суботнікаў пойдзе ў фонд індустрыялізацыі краіны. Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з думкай ЦП саюзу працасьветы аб адлічэньні асьветнікамі ў фонд індустрыялізацыі адпадзённага заработку паводле пастаноў агульных сходаў асьветнікаў.

Першая рабочая кіно-канфэрэнцыя.

Культаддзел ЦСПСБ супольна з Белдзяржкіно 10 жніўня склікае першую шырокую агульна-гарадзкую рабочую кіно-канфэрэнцыю.

Выбары на канфэрэнцыю будуць праводзіцца на рабочых сходах па прадпрыёмствах. У канфэрэнцыі прыме ўдзел каля 600 чалавек і яна працягнецца 2 дні.

Канфэрэнцыя абгаворыць даклад Белдзяржкіно аб становішчы кіно-справы ў БССР і вытворчасьці беларускіх кінофільм. Значнае месца ў працы канфэрэнцыі займе пытаньне абслугоўваньня масавага рабочага гледача. Канфэрэнцыя абярэ мастацка-палітычны савет кіно „Культура".

Вайсковы паход савгандльслужачых.

З жніўня саюз савгандльслужачых наладжвае агульна-гарадзкі вайсковы паход членаў саюзу.

У паходзе прыме ўдзел і падшэфная вайсковая часьць. У час паходу будзе арганізаваны паказальны начны бой, у паходзе прыме ўдзел звыш 1000 чалавек.

Асьветнікі—на дапамогу піанэрскаму зьлёту.

Цэнтральнае праўленьне саюзу працаўнікоў асьветы адпусьціла 125 руб. на выдаткі па піанэрскаму зьлёту.

Менскія асьветнікі на сваіх кватэрах разьмяркуюць 50 піанэраў-удзельнікаў Усебеларускага зьлёту.

Перад новым навучальным годам

Падача заяў у ВНУ і тэхнікумы праходзіць вельмі слаба. Апошняе тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што на мясцох было мала зьвернута ўвагі на шырокую інфармацыю рабочай і працоўнай сялянскай моладзі аб правілах прыёму ў ВНУ і тэхнікумы і наогул слаба пастаўлена праца па тлумачэньню насельніцтву аб нашых вышэйшых навучальных установах. Частка віны ёсьць і з боку Наркамасьветы, які вельмі позна выдаў справачнік.

Пры складаньні справачніку дапушчана памылка ў патрабаваньні справак аб сацыяльным складзе бацькоў паступаючага да вайны. У бліжэйшыя дні калегія НКА вынясе пастанову аб адмене прадстаўленьня гэтых справак і адказнасьць будзе ўскладзена на тых, хто завярае анкету.

На слабае паступленьне заяў у ВНУ адбіваецца і тое, што, скончыўшыя беларускія рабфакі, уяжджаюць паступаць у ВНУ і ВТНУ РСФСР,—уехала амаль 70 процантаў агульнага ліку рабфакаўцаў.

Заняткі ў навучальных установах пачнуцца своечасова—1 верасьня, а ва ўноў адчыняемых—1 кастрычніка.

Некаторымі навучальнымі ўстановамі прыняты меры да адшуканьня памяшканьняў для інтэрнатаў і да пашырэньня існуючых. Пастаўлена таксама пытаньне перад Менскім гарсаветам аб прадастаўленьні новых памяшканьняў для інтэрнатаў, але пытаньне гэта прасоўваецца наперад вельмі марудна, між тым да пачалу заняткаў засталося ўсяго адзін месяц.

Наркамасьветы ставіў пытаньне перад Белкаапсаюзам аб палепшэньні харчаваньня студэнтаў, але апошні ня ідзе насустрэчу. Між тым у другіх гарадох у гэтым напрамку справа стаіць лепш—каацэрацыйныя арганізацыі пайшлі насустрэч.

Пакуль ня позна, трэба мабілізаваць усю грамадзкасьць для выпраўленьня недахопаў.

ШАХМАТЫ № 25(170)

пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Задача № 24 Я. Камянецкага.



Бел. Крb7, Сс2, Сh6, Кd7 пп b2, b3, c4, d5, e6(9).
Чорн. Крd4, пп d6,e7 (3).
Мат у 3 ходы.

МАТЧ ПА ТЭЛЕГРАФУ.

Рэдакцыя вячэрняй „Чырвонай газэты" ў Ленінградзе з'арганізавала тэлеграфны матч між Раманоўскім і Багатырчуком. Іграецца дзьве партыі; пакуль што зроблены хады:

1 ПАРТЫЯ.

Бел. Багатырчук—Кіеў, Чорн. Раманоўскі—Ленінград.

1 d2-d4 Кg8-f6, 2 c-c2-c4 e7-e6, 3 Кg1f3 b7-b6, 4 g2-g3 Сс8-b7, 5 Сf1-d2 Сf8-b4+, 6 Кb1-d2 0-0, 7 0-0 c7-c5, 8 Кd2-b3 c5:d4, 9 Кb3:d4 d7-d5, 10 Кf3-e5 Сb4 d6, 11 Кe5-d3 Кf6-e4, 12 Кd3-f4 d5:c4, 13 Фd1-c2 Сd6:f4, 14 Сg2:c4 Сb7:e4, 15 Фc2:e4 Сf4:c1, 16 Лa1:c1 Фd8-d5, 17 Фe4:d5 e6:d5, 18 Лf1-d1 Лf8-d8, 19 Кd4-b5 Кb8-a6, 20 Лd1-d2 Лa8-c8, 21 Лc1-d1 Лc8-c5, 22 Кb5-c3 Кa6-c7.

II ПАРТЫЯ.

Бел. Раманоўскі. Чорн. Багатырчук.

1 Кg1-f3 d7-d5, 2 c2-c4 e7-e6, 3 g2-g3 d5:c4, 4 Сf1-g2 c7-c6, 5 Фd1-c2 b7-b5, 6 a2-a4 Сс8-b7, 7 Кb1-c3 a7-a6, 8 0-0 Кg8-f6, 9 Лf1-d1 Кf6-d5, 10 d2-d3 Кf6b4, 11 Фc2-b1 c4:d3, 12 Кf3-e5 Сf3-e7.

УСЕСАЮЗНЫ ШАХМАТНЫ ЗЬЕЗД.

Шахсэкцыя ВСФКБел. прапануе ўсім вылучаным у Беларускую шахматную каманду хутчэй прыслаць сваю згоду на паездку на спаборніцтвы ў Адэсу і верасьня. Вылучаны: Шаласў—Полацк, Гэйман і Блюмбэрг—Віцебск, Мялевіч—Гомель.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 30-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.83,5	
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.50	129.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.66	101.06
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.15	26.25
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.59	10.69
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.75	25.85
2 „ „ „ проц.	26.54,5	26.64,5
„ „ „ 6-проц.	25.46.5	25.56.5
II проц. дзярж. паз. 28 г.	104.52	104,52
12 проц. рэтная пазыка 1927 г.	101.96	—

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ПЕРШЫ ВОПЫТ.

(ПАХОД РАБОЧЫХ 1-Й ДЗЯРЖАЎНАЙ ДРУКАРНІ).

Паход узварушыў усю друкарню. Спэцыяльная мэдычная камісія агледзела ўсіх рабочых: хто можа ісьці, хто ня можа. А ісьці хацелася ўсім.

У адозьве, выпушчанай бюро партколектыву да рабочых друкарні, між іншым гаварылася: „Для таго, каб узмацніць вайсковую падрыхтоўку рабочых прадпрыёмства, партколектыў друкарні БДВ арганізуе 27 ліпеня вайсковы паход. У гэтым паходзе мы павінны будзем праверыць сваю вайсковую падрыхтаванасьць, праверыць сваю палітычную сьвядомасьць, праверыць дысцыпліна ванасьць нашых шэрагаў".

Паход быў падрыхтаваны добра. Усе рабочыя друкарні былі разьбіты на роты, узводы і аддзяленьні. Друкарня складае з сябе першы батальён Асоавіахіму.

Мэта паходу: прапрацаваць пяць этапаў—1) арганізацыя паходу, дысцыпліна марша, паходнае ахоўваньне, начная маскіроўка; 2) прывал, яго дысцыпліна, разьведка, дзяжурная часьць і г. д.; 3) трывога; 4) бой, тэхніка наступленьня; 5) выхад у райён абароны.

— Я вельмі нэрвуюся... Хутчэй-бы пайсьці!..

— Я, ведаеш, забыла і пашла ў туфельках, ды ящчэ белых..

Гэткія гутаркі былі чутны да пачатку паходу.

Прышоўшы на месца, узяліся за працу. Пачалося наступленьне, адступленьне. На практыцы рабочыя друкарні паказалі, што гэта **ня была сьвяточная прагулка, а сур'ёзная вайсковая падрыхтоўка.** Нават у часе вялікага дажджу выконвалі ўсе абавязкі.

Пасьля сканчэньня заняткаў быў наладжан разбор вынікаў паходу.

Сутнасьць заняткаў складалася з наступнага пасьля бойкі дзьве брыгады адышлі, і ў утвораны прарыў павінен быў увайсьці першы батальён і заняць гэтае месца, каб ня даць ворагу прарвацца.

Вельмі добра сваю справу выканалі сувязісты, а таксама жанчыны. Каммадаваньне гэта і адзначыла.

Было адзначана, што ня гледзячы на забарону, усё-ж некаторыя прайшлі праз пасевы, што зьяўляецца дрэнным у паходзе.

Таксама адмоўным зьяўляецца тое, што жанчыны вышлі ў паход не пабаявону, а ў туфельках.

Дысцыпліна маршу была добрая. Ахоўваньне—таксама. Але застава № 3 усё-ж прапусьціла праціўніка.

Адзін таварыш аказаўся вельмі баявым: вакол стралялі, а ён усё „пёр" наперад.

— Куды ідзеш?

— А вунь там... там на гары...

— Да ты-ж адзін нічога ня зробіш!

— А, нічога..

Дрэнна вышла з супроцьгазамі: у іх быў накладзен і хлеб і агуркі, і селядцы.

Падагульваючы паход, трэба сказаць што ён вельмі удаўся, ня гледзячы на некаторыя адмоўнасьці.

У паходзе прыняло звыш 200 чалавек, у тым ліку 100 беспартыйных рабочых, сярод якіх быў і 60 гадовы старык.

Пасьля паходу, прышоўшы ў лягер да сваей падшэфнай часьці, кожная рота выпусьціла «ільлічоўку», у якіх адбілі ўсебакова быт і настроі ўдзельнікаў паходу.

Гэты першы вопыт практычнай вайсковай вучобы цэлага прадпрыёмства трэба пашырыць на іншыя прадпрыёмствы.

Л. Палеес.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ УСТАНОЎ І АСОБ, ШТО Ў БЮЛЕТЭНІ СНК БССР № 6 1928 г. абвешчана Пастанова Народнага Камісарыяту унутраных Спраў аб перарэгістрацыі таварыстваў і саюзаў, якія ня маюць на мэце атрыманьня прыбыткаў, з паказаньнем парадку і тэрмінаў перарэгістрацыі.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Аўторак, 30 ліпеня
„ВЕСЕЛАЯ ВДОВА" у 3-х дзеях ЛЕГОРЫ
ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА", 3 аўторка 30 ліпеня БУЙНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК „СПРАВА 128" і кіно-хроніка савкіно № 34. Пачатак а 8 гадз., каса а 6 гадз.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. 3 аўторка, 30 ліпеня. Новы мастацкі —) фільм (— „ДЖАЛЬМА". кіно-драма ў 7 частках. Штодня 2 сэансы пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Грандыёзны мастацкі замежны фільм „ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА" паэма ў 7 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ „ДОНА ЖУАНА" пачатак а 7 з палов. гадз., каса а 6 г.

Заводу „АМО" патрабуецца „ВОЗДУХОДУВКА" дзеля даўленьня да 1500 м.-м. вадзянога слупа, вытворчасьцю каля 500 куб. мэтр. паветра ў мін. пры 3000 абаротах.

—) ПРАПАНОВЫ НАКІРОЎВАЦЬ: (—

Масква, 68, заводу „АМО"—камэрцыйны аддзел.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і каапэрацыі

НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

1. І. Мазур і К. Шапялевіч „Чырвоная Беларусь", чытанка для трэцяга году навучаньня, выданьне пятае, выпраўленае, стар. 500, цана 1 р. 50 к.
2. І. Пратасэвіч і Самковіч Рабочая кніга па беларускай мове, сыстэмат. курс морфол. і элемэнты сынтаксу стар. 156, цана 65 кап.
3. В. Біанкі „Мурзік", стар. 79, цана 40 кап.
4. Як робяць пасуду. Стар. 12, цана 32 к.
5. Аляскі сабака. Стар. 67, цана 40 к.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Магілеўскага Акруговага Таварыства Сельска-Гаспадарч. Крэдыту

АКТЫУ на 1-е кастрычніка 1928 году. ПАСЫУ

НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА
1. Каса	6705—42	1. Асноўны капітал	332900 —
2. Бяг. рахункі ў крэдытн. установах	242753—44	2. Узносы па падпісцы на паі і акцыі	1574—18
3. Дзяржаўн. і гарантав. урадам каштоўныя паперы	6857—98	3. Спэцыяльныя капіталы	27755—76
4. Кароткатэрмін. крэдытныя апэрацыі	412674—97	4. Іншыя ўласныя капіталы і фонды	99874—35
5. Доўгатэрм. мэтав. крэдыты. апэрацыі	2989609—68	5. Старон. сродкі і пазыкі для мэтав. крэд.	50992—85
6. Мэтавыя крэдыты ўстаноў с-г. крэд.	627104—63	6. Мэтавыя пазыкі ў установах с.-г. крэд.	3316818—83
7. Карэспандэнты	52805—58	7. Перадыскант, заклад і пераазклад	177030—24
8. Паі і акцыі	78104—72	8. Уклады і бягучыя рахункі	404405—10
9. Розныя дэбіторы	89757—68	9. Карэспандэнты	43676—68
10. Проценты, належачыя таварыству	15465—91	10. Няўстрэбаваныя сумы	42—45
11. Маёмасьць	8151—88	11. Камісійн. апэрацыі тавар. і каштоўнымі дакумантамі	925—07
12. Выдаткі, пераходз. на наступны час	506—82	12. Розныя крэдыторы	14012—89
13. Проценты заплоч. і наліч. наступн. году	6609—73	13. Проценты і прыбыткі, пераходз. на наступны год	11242—28
		14. Прыбытак	55857—80
Балянс	4537108—44	Балянс	4537108—44

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

ДЭБЕТ — ЗА 1927-28 АПЭРАЦЫЙНЫ ГОД — КРЭДЫТ

НАЗВА РАХУНКАЎ	Сума	НАЗВА РАХУНКАЎ	Сума
1. % % аплачаныя і наліччаныя	109210—59	1. % % атрыманыя і наліччаныя	195383—95
2. Камісія аплачаная	245—98	2. Камісія атрыманая і наліччаная	2629—49
3. Сьпісан. на пагаш. пратэст. вэксалёў і няпэўных даўгоў	6590—63	3. Іншыя даходы	597—74
4. Адлічэньні ў фонд пагашэньня маёмасьці	639—15		
5. Іншыя сьпісаньні і страты	209—29		
6. Бягучыя выдаткі	25857—77		
Усяго выдаткаў	142753—41	Усяго прыбыткаў	198611—21
Чысты прыбытак	55857—80		
Балянс	198611—21	Балянс	198611—21

Старшыня праўленьня ЕЛІНЕУСКІ. Старшыня рэвкамісіі ЛЫСЯНКОУ.

Галоўны бухгальтар ЗЯБЛАУ.

Галоўлітбел 595. Менск, дзяржаўная друкарня